ЦІ ТРЭБА ЗАМЯНЯЦЬ ЦУКАР? 7

КАСЦЮМЫ ДЛЯ ВЯЛІКАГА З ВОЎНЫ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 СНЕЖНЯ 2019 г. СЕРАДА № 230 (29097)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

«Раней у Беларусі пастановай Савета Міністраў ужо былі зроблены больш жорсткімі патрабаванні, што прад'яўляюцца да якасці аказання жыллёва-камунальных паслуг, а таксама зменены ў бок павелічэння працэнт вяртання грашовых сродкаў спажыўцам за няякасна аказаныя паслугі. Пасля прыняцця змен у Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг» мы плануем для павышэння якасці паслуг зрабіць гэтыя патрабаванні яшчэ больш жорсткімі, каб прымусіць нядбайных камунальнікаў, калі хтосьці дзесьці недапрацоўвае, аказваць паслугі ў поўным аб'ёме».

КАРАТКА

• Паміж Нацыянальным аэрапортам Мінск і чыгуначным вакзалам сталіцы плануецца будаўніцтва аэраэкспрэса (час у дарозе — 30—35 хвілін). Праект папярэдне ацэньваецца ў $150 млн.

• **ІТ-аўдыт пройдзе ў дзевяці банках Беларусі.**

• Першы рэспубліканскі злёт валанцёраў сярэбранага веку (60+) адбудзецца 5 снежня ў Палацы культуры ветэранаў.

• **БРСМ і Расійскія студатрады распрацавалі дарожныя карты супрацоўніцтва.**

• У Віцебскай вобласці прынялі распараджэнне аб забароне выхаду на лёд.

• **У Мінскім раёне ў выніку сямейнага канфлікту 22-гадовы сын у мэтах самаабароны і абароны маці нанёс некалькі ўдараў нажом нецвярозаму 44-гадоваму бацьку. Апошні памёр, раней ён прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за пагрозу забойствам у дачыненні да сваёй жонкі.**

ЛЁС ЛЯЦЕЦЬ НА ДВУХ КРЫЛАХ

Па выніках перагавораў у Бялградзе прэзідэнты Беларусі і Сербіі падпісалі восем дакументаў аб супрацоўніцтве

Чатыры з іх датычыліся ўзаемадзеяння ў навуковай сферы: мемарандум аб узаемаразуменні пры ажыццяўленні супрацоўніцтва ў галіне інавацый і развіцця лічбавых тэхналогій, пагадненні аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з Сербскай акадэміяй навук і мастацтваў, Міністэрствам адукацыі, навукі і тэхналагічнага развіцця Сербіі і пратакол дзявятага пасяджэння беларуска-сербскай камісіі па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

Фота БелТА.

Падчас афіцыйных перагавораў кіраўнікі краін асаблівую ўвагу звярнулі на эканамічны складнік адносін. Летась тавараабарот склаў 148 мільёнаў долараў, але, па словах лідара Сербіі Аляксандра Вучыча, дзяржавам пад сілу лічба ў паўмільярда.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, у сваю чаргу, заявіў, што Беларусь і Сербія яшчэ пазмагаюцца і паваююць за развіццё эканамічных адносін.

«Не мае значэння, што ў нас трохі знізіўся тавараабарот. Мы з вамі разбяромся, чаму ўрады не разгортваюцца як след. Вынікі ўчарашняга дня, пачатак сённяшняга кажуць пра тое, што нашы міністры адрэагавалі на зніжэнне тавараабароту, заключылі буйныя кантракты, здзелкі, каб перасягнуць той тавараабарот, які ў нас калісьці быў», — паведаміў ён.

Зрабіць гэта магчыма, бо паміж Беларуссю і Сербіяй устанавіліся асаблівыя сяброўскія адносіны. Пра гэта нагадаў Аляксандр Вучыч: «Я ніколі не забуду ваш візіт у 1999 годзе. Вы прыехалі, каб паказаць, наколькі любіце сербскі народ і краіну».

СТАР. 2

БРЭСЦКІ НАПРАМАК

інвестыцый, ІТ-тэхналогій і аграрнай вытворчасці

Чвэрць 25 стагоддзя

Сёння Брэсцкая вобласць адзначае 80-гадовы юбілей. З гэтай нагоды старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС адказаў на пытанні нашага карэспандэнта пра дасягненні і набыткі вобласці, пра новыя праекты і перспектывы асобных рэгіёнаў у традыцыйнай рубрыцы «Звязды», прысвечанай развіццю краіны за 25 гадоў.

СТАР. 4-5

САЛЮТ З НАСТУПСТВАМІ



Нягледзячы на тое, што да Новага года застаецца амаль месяц, вечаровы спакой раз-пораз ужо парушае гук ад петардаў. За прыгожымі візуальнымі эфектамі, аднак, стаіць істотная рызыка. Варта дапусціць усяго адну памылку — і наступствы могуць быць вельмі сумныя.

Хоць снежань толькі пачынаецца, але адзін інцыдэнт са святочнай выбухоўкай ужо здарыўся. У Мінскім гарадскім упраўленні па надзвычайных сітуацыях расказалі, што адбылося гэта на мінулых выхадных. Дванаццацігадовы хлопчык гуляў каля свайго дому. Ён знайшоў петарду, высыпаў адтуль порах і падпаліў яго. Скончыліся гэтыя эксперыменты апёкам рагавіцы вока і твару 1-й і 2-й ступені. Малога шпіталізавалі.

ПАЛЯВАЎ НА КРАТА З ПЕТАРДАЙ

Нягледзячы на тое, што летась навагодняя піратэхніка не выбіла ніводнай аконнай шыбы і не падпаліла ніводнага аўтамабіля, людзі ўсё ж пацярпелі. За мінулы снежань і пачатак студзеня гэтага года ў краіне адбыліся 34 няшчасныя выпадкі, звязаныя з памылкамі пры запуску піратэхнічных вырабаў. Сярод траўміраваных — 11 дзяцей. Паказальна, што гэтыя лічбы амаль удвая меншыя, чым за год да таго.

І не заўжды такія траўмы звязаныя з шумным святкаваннем. Напрыклад, летась 11 снежня ў прыёмны пакой Пінскай цэнтральнай раённай бальніцы прывезлі 49-гадовага мужчыну. Выбухам петарды яму адарвала фалангу пальца. Але інцыдэнт адбыўся каля гадзіны дня. Які сэнс запускаць петарду ў гэты час, калі ніякіх светлавых эфектаў не будзе відаць? Прычына, як аказалася, была не забаўляльная, а гаспадарчая. Пацярпелы намагаўся такім рызыкоўным спосабам расправіцца з кратом. Для гэтага ён падпаліў петарду і хацеў яе кінуць у нару, але не паспеў. І піратэхнічны выраб разарваўся ў руцэ.

Пік няўдалых запускаў піратэхнікі з сумнымі наступствамі традыцыйна прыйшоўся на 1 студзеня. У тым ліку — і з дзецьмі, якіх дарослыя бяруць з сабой на вуліцу. А дзясятай гадзіне першага дня новага 2019 года ў Жлобіне бацька запусціў петарду ў двары жылога дома. Нешта пайшло не так — святочная выбухоўка не ўзарвалася, а ўпала на зямлю. Да петарды падбег яго двухгадовы сын, падняў яе — і ў гэты момант прылада спрацавала. Хлопчыку, можна сказаць, яшчэ пашанцавала — яго шпіталізавалі ў бальніцу з рванай ранай пальца левай рукі і тэрмічным апёкам твару.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

ЛЁС ЛЯЦЕЦЬ НА ДВУХ КРЫЛАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У красавіку 1999 года, калі авіяцыя НАТА бамбіла сербскія гарады, дэлегацыя нашай краіны на чале з Аляксандрам Лукашэнкам наведала Бялград з афіцыйным візітам. Поўную бяспеку беларускаму борту № 1 Паўночнаатлантычны альянс не гарантаваў. Вось што праз 20 гадоў Прэзідэнт Беларусі расказаў пра тыя падзеі: «Тады ніхто не думаў пра тое, што мы здзяйсняем нейкі гераічны ўчынак: мы ехалі да сваіх братоў, сяброў. Калі-небудзь я ў дэталях раскажу, што гэтаму папярэднічала, што было потым, але так склалася, што мы не маглі кінуць у бядзе блізкіх нам людзей. Так, мы не гіганцкая імперыя, але мы вашы людзі, а вы — нашы».

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, што тады былі няпростыя часы, але і сёння яны складаныя. Буйныя геапалітычныя гульцы, каб выжыць у канкурэнцыі, ствараюць напружаную абстаноўку ў свеце — па віне адной з «імперый» ідзе гандлёвая вайна, іншыя мераюцца сіламі ў Сірыі.

«Ад гэтага пакутуеце і вы, таму што вялізны паток, сотні тысяч бежанцаў хлынулі сюды. Пачалі ўжо сур'ёзна пагаворваць пра новы сусветны эканамічны крызіс. Нам гэтага не трэба. Мы, на жаль, удзельнікі ўсяго гэтага, але віна не ў нас», — падкрэсліў беларускі лідар.

Сербію ён назваў балканскай жамчужынай і запэўніў, што Беларусь будзе дапамагаць у яе аднаўленні: «Гэта цудоўная краіна, цудоўная зямля, якая можа пракарміць значна больш насельніцтва, чым сёння жыве ў Сербіі. Гэта бліскучы, гераічны, патрыятычны народ. Таму Сербія заўсёды будзе квітнеючай».

На перагаворах у пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка адзначыў асаблівасць у адносінах краін — дзяржавы ніколі не ставілі ўмоў адна адной.

«Многія малыя, сярэднія дзяржавы (я гэта за сваё доўгае прэзідэнцкае жыццё бачыў не адзін раз) заўсёды арыентуюцца на гэтыя гіганцкія і багатыя дзяржавы, таму што яны валодаюць тымі рэсурсамі, якіх не хапае ў нас. Але мы не павінны забываць пра тое, што любыя імперыі і буйныя дзяржавы ніколі з намі не будуць супрацоўнічаць без папярэдніх умоў, яны абавязкова нешта папросяць наўзамен, нават яшчэ нічога для цябе не зрабіўшы», — перадае словы беларускага лідара БелТА.

Не абышоў Аляксандр Лукашэнка складаную, але важную для кожнага серба праблему Косава. Ён сказаў, што Беларусь не змяняе сваю пазіцыю па пытаннях тэрытарыяльнай цэласнасці Сербіі.

Кіраўнік нашай краіны адзначыў, што з павагай ставіцца да жадання Сербіі стаць членам Еўрапейскага саюза.

«Еўрапейскі саюз — гэта адна з наймагутнейшых апор нашай планеты. Калі яе выдраць з-пад гэтай сістэмы, яна не проста захістаецца, а можа абрынуцца. Таму я прыхільнік захавання Еўрапейскага саюза, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: «Вы ж бачыце, якая сітуацыя ў самім Еўрапейскім саюзе. Ім не да прыёму новых членаў, хоць бы захаваць старых».

Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены: брацкая краіна зможа знайсці шчасце і ў ЕС, і ў ЕАЭС, з якім падпісала пагадненне аб зоне свабоднага гандлю. У Еўрапейскім саюзе палічылі, што гэта пярэчыць імкненню Сербіі стаць яго членам. Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што Сербія разбярэцца з падобнымі ўльтыматумамі самастойна. «Вы разумныя, таленавітыя людзі. Вы зможаце ўсё ўзважыць. Калі вам будзе выгадна пры ўльтыматуме супрацоўнічаць з Еўрапейскім саюзам, вы будзеце супрацоўнічаць з ім. Калі вам будзе больш выгадна мець справу з Еўразійскім эканамічным саюзам, вы будзеце супрацоўнічаць з ім. Але, на жаль, у вас, як і ў нас, лёс ляцець на двух крылах. У вас, нікуды ад гэтага не падзецца, павінны быць добрыя адносіны перш за ўсё з суседзямі, якія б яны ні былі», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Вучыч адзначыў, што Сербія заўсёды будзе шчырым сябрам Беларусі: «Былі часы, калі некаторыя баяліся сказаць, наколькі мы цэнім і любім беларускі народ. Сёння мы ўсюды гаворым пра гэта з гонарам і хочам, каб вы прыязджалі сюды як мага часцей».

Пасля перагавораў ён таксама паведаміў прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі аб тым, што Беларусь дапаможа рэфармаваць армію Сербіі, зрабіць яе больш мабільнай і хуткай.

* * *

Выступаючы ў Народнай скупшчыне Сербіі, Прэзідэнт Беларусі сказаў, што цяперашні візіт мае для яго асаблівае значэнне. Па словах кіраўніка нашай дзяржавы, за 25 апошніх гадоў краінамі пройдзены няпросты гістарычны шлях, галоўнае дасягненне якога — «магчымасць быць гаспадарамі на сваёй зямлі, самастойна вызначаць кірункі развіцця, адпаведныя духу часу і дзяржаўным інтарэсам».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Сербіі далучыцца да абмеркавання праблем сусветнай бяспекі. Ён звярнуў увагу на нарастанне напружанасці ў адносінах паміж краінамі, расхістванне асноў глабальнай бяспекі, павелічэнне колькасці рэгіянальных канфліктаў. На яго думку, неабходна выступаць за вырашэнне любых спрэчак выключна мірным шляхам, на аснове нормаў міжнароднага права.

«Беларусь вылучыла ініцыятыву аб узнаўленні шырокага дыялогу ад Атлантыкі да Уладзівастока па ўмацаванні мер даверу, бяспекі і супрацоўніцтва. Лічу, што Сербія будзе ў ліку дзяржаў, зацікаўленых у абмеркаванні гэтых праблем. Бо Югаславія ў свой час была адным з заснавальнікаў Руху недалучэння. Гэтая арганізацыя дазволіла краінам так званага трэцяга свету заявіць пра сябе на міжнароднай арэне, данесці свой голас да вялікіх дзяржаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пракаментаваў нядаўнія парламенцкія выбары ў Беларусі: «Паверце, больш за тую дэмакратыю і свабоду, у якой праходзілі выбары ў Беларусі, мы не зробім. Мы, напэўна, проста не здолеем правесці лепш. Мы ўсяляк імкнуліся дагадзіць не толькі нашым спонсарам і заўзятарам на Усходзе, але і ў Еўрасаюзе. І што ў выніку? Адны былі ўражаныя вынікамі выбараў, а іншыя сказалі: апазіцыя не трапіла ў парламент — бяда, значыць, дрэнна ці недэмакратычна, значыць, зноў няма свабоды, дыктатура. Глупства поўнае. Мы нікога не ціснулі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што заходнія назіральнікі загадзя падрыхтавалі негатыўныя справаздачы пра выбары ў Беларусі, а потым толькі падпісалі іх. «Я хацеў, каб было тры, пяць, дзесяць апазіцыянераў, — дадаў ён. — Але як іх правесці, калі ў апазіцыянераў 3,5 % галасоў?»

На думку Прэзідэнта, бяда беларускай апазіцыі ў тым, што яна працуе толькі ў перыяды электаральных кампаній. «Які народ абярэ такую апазіцыю? І жыве апазіцыя на замежныя гранты: фонды Эберта, Адэнаўэра, амерыканскія фонды. Нідзе не працуюць — у добрых асабняках жывуць, на добрых аўтамабілях раз'язджаюць. Народ задаецца пытаннем: адкуль? Адказу няма», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. На мінулых парламенцкіх выбарах у Беларусі грамадзяне падтрымалі тых кандыдатаў, якія працуюць і прыносяць карысць грамадству, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар дадаў, што заходнім партнёрам не падабаецца палітыка, якая праводзіцца Беларуссю, таму ў свой час ЗША і Еўрасаюз увялі супраць краіны санкцыі. Аднак з часам яны зразумелі, што гэта была памылка, звярнуў увагу Прэзідэнт. «Яны шукалі нагоду, каб, захаваўшы аблічча, выйсці з гэтай сітуацыі. І наша пазіцыя па асноўным парадку міжнародных адносін аказалася для свету прымальная. Таму сітуацыя рэзка памянялася, і мы сёння спрабуем наладзіць нашы адносіны з Еўрапейскім саюзам, выступаючы катэгарычна супраць усялякіх «брэксітаў» і супраць яго распаду», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы запрасіў сербскіх дэпутатаў адкрыць для сябе Беларусь: гасцінную, прадпрымальную і адказную, багатую сваёй культурнай і гістарычнай спадчынай, сапраўды славянскую, душэўную і вельмі блізкую Сербіі.

Класныя навіны

PISA-ШОК ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ... АДМЯНЯЕЦЦА!

Учора сталі вядомыя вынікі апошняга міжнароднага даследавання адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA (Program for International Student Assessment).

У многіх краінах іх абвяшчэнне становіцца адной з галоўных падзей. І калі сістэма адукацыі аказваецца вельмі далёка ад сусветных лідараў, гэта разглядаецца як нацыянальная пагроза і сігнал, што трэба тэрмінова штосьці мяняць: пераглядаць патрабаванні да адукацыйных стандартаў, уносіць карэктывы ў вучэбныя праграмы і планы, змяняць падыходы да выкладання вучэбных дысцыплін і гэтак далей. Так, першыя вынікі PISA ў Германіі ў 2000 годзе паказалі нізкі ўзровень ведаў навучэнцаў у параўнанні з іх аднагодкамі з іншых краін і выклікалі ў грамадстве рэакцыю, якую назвалі «PISA-шок».

Даследаванне праводзіцца кожныя тры гады, а затым на працягу яшчэ аднаго года аналізуюцца вынікі тэстаў, перш чым яны будуць прадстаўлены сусветнай грамадскасці. Першы рэйтынг быў складзены ў 2000 годзе. Вынікі апошняга агучаны 3 снежня 2019 года. У даследаванні, што праходзіла летась, удзельнічала 79 краін і адміністрацыйна-эканамічных тэрыторый. Для беларускіх падлеткаў гэта быў першы вопыт удзелу ў міжнародным даследаванні.

— Тым не менш нашы навучэнцы прадэманстравалі даволі высокі ўзровень па ўсіх трох кірунках даследавання, паказаўшы вынікі, якія перавышаюць сярэднія агульнасусветныя паказчыкі, — паведаміў журналістам **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.** — Беларусь заняла месца ў першай палове агульнасусветнага рэйтынгу. Так, у рэйтынгу чытацкай адукаванасці ў беларускіх падлеткаў 36-я пазіцыя, у матэматычнай — 38-я і ў прыродазнаўчанавуковай — 37-я.

У PISA-2018 удзельнічала 236 беларускіх устаноў адукацыі: 176 школ, 27 гімназій, шэсць ліцэяў, 13 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 14 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі — усяго былі ахоплены 5830 падлеткаў. Для атрымання аб'ектыўнай карціны выбарка ўстаноў адукацыі і навучэнцаў рабілася выпадковым чынам арганізацыяй Westat (ЗША). Наша Міністэрства адукацыі ніяк не магло паўплываць на іх выбар.

Будзь у курсе!

У рамках PISA правяраюцца не столькі акадэмічныя дасягненні 15-гадовых падлеткаў, колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі, здольнасць вучыць устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, іх уменне супастаўляць факты і аналізаваць, хутка прымаць рашэнні, выкарыстоўваць набытыя веды і вопыт для вырашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач.

Тэсціраванне PISA праводзілася ў камп'ютарным фармаце. Гэта быў кагнітыўны тэст, на выкананне якога адводзілася дзве гадзіны, плюс апытальнік, на запаўненне якога давалася яшчэ 35 хвілін. Кантроль за ходам правядзення тэсціравання ажыццяўляўся нацыянальнымі і міжнароднымі назіральнікамі.

Цікава, што навучэнцы некаторых гімназій і ліцэяў паказалі ўзровень ведаў, які не саступае лідарам сусветнага рэйтынгу. Пра гэта паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.**

Кожны раз акцэнты ў даследаванні змяшчаюцца. У 2018 годзе галоўны ўпор быў зроблены на чытацкую адукаванасць — здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягаць сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці ўдзелу ў сацыяльным жыцці. Беларускія школьнікі набралі па чытацкай асвеце 474 балы, а сярэдні бал усіх краін — 454. Для параўнання: у расійскіх школьнікаў — 479 балаў, украінскіх — 466, літоўскіх — 476.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Генсек ААН: планета блізкая да «пункту незвароту»

Такім чынам генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш акрэсліў сучасную экалагічную абстаноўку ў свеце падчас адкрыцця ў Мадрыдзе канферэнцыі ААН па праблемах змены клімату, перадае Euronews. Ён заклікаў сусветных лідараў праявіць палітычную волю і прадухіліць катастрафічныя наступствы глабальнага пацяплення. «У найбліжэйшыя дзесяцігоддзі нам давядзецца выбраць свой шлях. Альбо мы капітулюем у паўбяспамятным стане, альбо мы станем на шлях надзеі і доўгатэрміновых рашэнняў», — заявіў генеральны сакратар ААН.

Японія за 146 мільёнаў долараў набудзе востраў для ваенных вучэнняў ЗША

Урад Японіі заявіў, што мяркуецца выкупіць з прыватнай уласнасці бязлюдны востраў каля паўднёва-заходняга ўзбярэжжа за 146 мільёнаў долараў для амерыканскіх ваенных вучэнняў, паведаміў генеральны сакратар кабінета міністраў краіны Ёсіхідэ Суга. Паводле яго слоў, адпаведны аб'ект будзе пабудаваны тут «у хуткім часе». Праўда, некаторыя жыхары, якія жывуць на навакольных астравах, выказалі занепакоенасць у сувязі з тым, што ваенная база можа выдаваць занадта шмат шуму. Цяпер трэніроўкі ВПС ЗША праходзяць на востраве Івадзіма, што за 1,2 тысячы кіламетраў ад Токіа. Вашынгтон запатрабаваў змяніць месца вучэнняў у сувязі з тым, што Івадзіма знаходзіцца занадта далёка ад ваеннай базы ЗША ў горадзе Івакуні прэфектуры Ямагуці.

У Віфлеем праз 1400 гадоў вярнулася ўнікальная хрысціянская рэліквія

Бясцэнная хрысціянская рэліквія — кавалачак дрэва, з якога, паводле падання, былі зробленыя яслі Хрыстовы, — вярнулася ў Віфлеем з Рыма праз 1400 гадоў. Папа Рымскі Францыск распарадзіўся адправіць святыню, якая з VII стагоддзя захоўвалася ў базіліцы Санта-Марыя-Маджорэ, у якасці дару. Падчас дарогі дадому рэліквія была на непрацяглы час выстаўлена на агляд у Іерусаліме. Кавалачак дрэва даўжынёй усяго некалькі сантыметраў у разьбяным абрамленні быў урачыста сустрэты ў Віфлееме з аркестрам і святочнай працэсіяй. Пасля гэтага рэліквія была перанесена ў францысканскую царкву Святой Кацярыны паблізу ад базілікі Нараджэння Хрыстовага. Хрысціяне вераць, што маленькія кавалачкі дошчачкі, змацаваныя металічнымі палосамі, калісьці былі часткай ясляў — кармушкі для жывёлы, куды паклалі немаўля-Хрыста пасля нараджэння. Паводле Евангелля, Дзева Марыя і Іосіф прыбылі ў Віфлеем, каб зарэгістравацца для перапісу, які праводзіўся па ўказанні рымскага імператара. Паколькі ўсе гасцініцы і заезныя двары былі перапоўненыя, святое сямейства было вымушана размясціцца на начлег у хляве, дзе і нарадзіўся Ісус Хрыстос.

НАШЫ — НА ПАЎДНЁВЫМ ПОЛЮСЕ ЗЯМЛІ

Беларускія палярнікі распачалі навуковыя даследаванні ў Антарктыдзе. Пра гэта Прэзідыум НАН Беларусі праінфармаваў начальнік 12-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі (12-я БАЭ) Аляксей Гайдашоў.

Супрацоўнікамі ўжо выкананы шэраг работ. Так, у рамках навуковай праграмы па даследаванні змяненняў прыроднага асяроддзя і клімату Зямлі Эндэрбі пад уплывам антрапагенных і прыродных фактараў разгорнута метэаралагічная станцыя М-49М. Распачалася рэгулярная перадача метэазвестак на замежныя антарктычныя станцыі, а таксама ў Міжнародны Антарктычны лагістычны цэнтр у Кейптаўне для забеспячэння ўнутрыантарктычных палётаў авіяцыі. Абсталяваны снегамерны пост, распачата назіранне за вышынёй снежнага покрыва.

У лабараторыі фізікі атмасферы разгорнуты пункт азонаметрычных назіранняў. З выкарыстаннем распрацоўкі Інстытута фізікі НАН Беларусі на трох палігонах праведзены серыі вымярэнняў спектраў адлюстравання розных тыпаў падсцілаючай паверхні. У рамках біялагічнай праграмы выкананы выхад на лёд бухты Лазурная — праведзены адлоў узораў іхтыфаўны (35 экзэмпляраў).

Удзельнікамі 12-й БАЭ праведзены комплекс работ па далейшым разгортванні сістэм жыццезабеспячэння. Асабовы склад здаровы. У калектыве падтрымліваецца роўны маральна-псіхалагічны клімат, арганізацыя работ і даследаванняў нацэлена на вынік. Прыборы для навуковых назіранняў, сістэмы жыццезабеспячэння, сродкі транспарту і сувязі працуюць у штатным рэжыме. На Беларускай антарктычнай станцыі ёсць неабходныя запасы паліва, прадуктаў харчавання, медыкаментаў. З расійскімі станцыямі «Прагрэс», «Новалазараўская», палявой базай «Маладзёжная» і бортам НЭС «Акадэмік Трошнікаў» падтрымліваецца ўстойлівая сувязь.

Над Беларускай антарктычнай станцыяй у гонар адкрыцця 12-га антарктычнага сезона ўзняты дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь і сцяг Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Дванаццатая беларуская антарктычная экспедыцыя накіравалася на ледзяны кантынент 8 лістапада. Упершыню ў яе складзе на Паўднёвы полюс Зямлі адправіліся адразу дзесяць беларусаў. Сярод іх ёсць як бывалыя палярнікі (іх роўна палова), так і навічкі. Палярнікам трэба будзе не толькі прадоўжыць нарошчванне інфраструктуры першай чаргі Беларускай антарктычнай станцыі, але і правесці вялікі комплекс навуковых даследаванняў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

САЛЮТ З НАСТУПСТВАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А вось у Брэсце 14-гадовая дзяўчына пацярпела ад чужой неабачлівасці. Каля поўначы 5 студзеня яе прывёў у бальніцу бацька. Школьніца патлумачыла, што незадоўга да таго яна праходзіла побач з кінатэатрам. Якраз у гэты час нехта запусціў там петарду. Вынік — апёк першай ступені павека левага вока.

Бесклапотнасць часам прыводзіць і да горшых наступстваў. Каля поўдня першага снежня мінулага года ў Лях авіцкую цэнтральную раённую бальніцу прывезлі 35-гадовага мужчыну з выбуховай траўмай бакавой паверхні грудной сценкі. Траўма — як падчас баявых дзеянняў. Няўжо такое магла нарабіць піратэхніка? Аказалася, што магла, і вельмі проста. Як патлумачыў сам пацярпелы, петарда выбухнула ў... нагруднай кішэні.

А больш за ўсіх дасталося 16-гадоваму юнаку з вёскі Малькавічы Ганцавіцкага раёна. Яго даставілі ў раённую бальніцу з апёкамі рагавіцы вачэй другой ступені, кантузіяй вочных яблыкаў, апёкам першай ступені скуры твару, ранамі вуснаў. Апёк трэцяй ступені быў дыягнаставаны нават каля калена. Прычынай усяго гэтага стаў феерверк, які разарваўся дачасна...

УСЁ ПРАПІСАНА Ў ІНСТРУКЦЫІ

— Кожны год мы разам з прадстаўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў удзельнічаем у рэйдах, падчас якіх выкрываюцца факты гандлю нелегальнай піратэхнікай. Або калі яна захоўваецца неналежным чынам, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.**

Летась у гандлёвым пункце індывідуальнага прадпрымальніка з Лепеля амаль 12 тысяч піратэхнічных вырабаў захоўвалася з парушэннем правіл бяспекі. Гаспадара аштрафавалі, а святочную выбухоўку на 1050 рублёў канфіскавалі. Але куды большы «ўлоў» чакаў рэйдавую групу на сталічным праспекце Ракасоўскага. Індывідуальны прадпрымальнік не знайшоў для схованкі піратэхнікі лепшага месца, як падвал у доме, дзе жыў. Кошт канфіскаванай маёмасці склаў каля 20 тысяч рублёў.

— Даўно адменена правіла, згодна з якім гандляваць піратэхнікай можна было толькі 45 дзён на год. Таму няма ніякага сэнсу купляць яе «пра запас» скрынямі. Тым больш што ў цесным памяшканні іх нярэдка і паставіць праблематычна. На балкон яе выносіць нельга, таму што яна адсырэе. У выніку петарды або ўвогуле не спрацуюць, або салюты і феерверкі пачнуць паводзіць сябе нестандартным чынам. Каля сцен, дзе праходзіць сістэма ацяплення, размяшчаць святочную выбухоўку таксама нельга. Быў у нас выпадак, калі з-за моцных маразоў тэмпература цепланосьбіта была пададзена на максімум і ад гэтага адбылася дэтанацыя, — успамінае Віталь Навіцкі.

Сертыфікаваная піратэхніка абавязкова мае пры сабе інструкцыю або на рускай, або на беларускай мове. Там у максімальна зразумелай форме тлумачацца ўсе правілы абыходжання з небяспечным вырабам.

— Калі жаданнем пайсці па «нелегальную» піратэхніку кіруе думка купіць штосьці такое, што немагчыма набыць у афіцыйным пункце продажу, то тут будзе чакаць неспадзяванка. Піратэхніка чацвёртага і пятага класаў не выкарыстоўваецца ў грамадзянскім абарачэнні. Яе прымяняюць толькі на масавых мерапрыемствах, дзе з ёй працуюць выключна кваліфікаваныя супрацоўнікі. У рознічны ж продаж паступае піратэхніка першага, другога і трэцяга класаў. Падзел ідзе згодна з аб'ёмам выбуховага рэчыва, якое закладваецца ўнутр, і далёкасцю палёту, — тлумачыць спецыяліст.

Калі прааналізаваць медыцынскія зводкі, звязаныя з атрыманнем траўмаў ад піратэхнікі, то ўсё грунтуецца па двух фактарах — чалавечым і заводскім браку. З першым усё зразумела — дзесьці была парушана інструкцыя па запуску. Зарад прагарэў вельмі хутка і прагучаў выбух. А вось як быць тады, калі, здаецца, усё зроблена правільна, а замест маляўнічага салюту чуецца толькі глухое шыпенне?

— Увогуле падчас запуску адлегласць да найбліжэйшых пабудоў, дрэў, ліній электраперадачы, аўтамабіляў ці проста выпадковых мінакоў мусіць быць не меншай за трыццаць метраў, — нагадвае прадстаўнік МНС правілы бяспекі. — Запускаць піратэхніку мусіць толькі абсалютна цвярозы чалавек — на жаль, кожны год бываюць выпадкі, калі апёкі ад няўдала запушчанай петарды атрымліваюць людзі нападпітку, не здольныя поўнасцю кантраляваць працэс. Дзяцей нельга блізка падпускаць да месца плануемага выбуху. Калі ж зарад не спрацаваў, то трэба пачакаць паўгадзіны, а пасля адкрыць інструкцыю. У залежнасці ад тыпу вырабу рэкамендацыі звычайна простыя — або засыпаць пяском, або асцярожна заліць вадой. І ні ў якім разе не нагінацца над імі, каб не атрымаць прамы ўдар у твар.

І АБМЕЖАВАННІ НА ПЕРАМЯШЧЭННЕ

У Дзяржаўным мытным камітэце адзначылі, што ўсе піратэхнічныя вырабы ўнесены ў пералік тавараў двайнога прызначэння, якія могуць быць выкарыстаны пры стварэнні ўзбраення або вайсковай тэхнікі. Таму нават для асабістых патрэб перамяшчаць іх фізічным асобам праз граніцу забаронена. Дазволеную рэгламентамі Еўразійскага саюза піратэхніку на тэрыторыю Беларусі могуць увозіць індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы пры наяўнасці спецыяльных дакументаў, якія выдаюцца МНС.

Са святочнай выбухоўкай таксама нельга заходзіць у метро. Пункт 68 Правіл перавозак метрапалітэнам без выключэнняў катэгарычна забараняе яе транспартаваць «падземкай». Гэта значыць, што калі такія рэчы будуць знойдзены падчас дагляду асабістых рэчаў, то вас на перон станцыі не пусцяць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Крымінал, здарэнні

УГНАЎ У ДЗЯДЗЬКІ СЛУЖБОВУЮ МАШЫНУ

26-гадовы непрацуючы малады чалавек, жыхар Бешанковіцкага раёна, прыйшоў у госці да сваяка, які, вяртаючыся з камандзіроўкі, заехаў да сябе на дачу ў вёску Сокарава. Вясковец без дазволу ўзяў ключы ад службовага аўтамабіля ГАЗ-3302.

Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, крыху пазней ён сеў за яго руль і адправіўся ў кавярню ў аграгарадок Ула. Пакуль малады чалавек з прыяцелямі весела праводзіў час за распіццём спіртных напояў, мужчына, які застаўся без машыны, адправіўся ў міліцыю па дапамогу.

Затрымалі ўсю кампанію праз пару гадзін пасля звароту пацярпелага да праваахоўнікаў. Да гэтага часу ўгоншчык, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, ужо паспеў наездзіць па раёне амаль 50 кіламетраў. Акрамя пратаколаў па лініі ДАІ ў дачыненні да маладога чалавека заведзена крымінальная справа за ўгон.

ЛОСЬ ПРАВАЛІЎСЯ ПАД ЛЁД

На дапамогу прыйшлі ратавальнікі

Удзень у службу выратавання Гарадка Віцебскай вобласці ад дырэктара раённага таварыства паляўнічых і рыбаловаў паступіла паведамленне аб тым, што пад лёд на возеры Чарнова каля вёскі Лука Гарадоцкага раёна праваліўся лось.

Калі ратавальнікі прыбылі на вадаём, то ўбачылі, што жывёла знаходзіцца на адлегласці 250 метраў ад берага пад лёдам і самастойна выбрацца на сушу не можа. Работнікамі МНС пры дапамозе гідратэрмакастюма і дошкі для ратавання лось быў выцягнуты. Ён не пацярпеў, сышоў у лес, у ветэрынарнай дапамозе не меў патрэбы, паведамілі ў МНС.

«ПАЗЫЧЫЛІ» Ў БАЦЬКІ СЯБРОЎКІ 9,5 ТЫСЯЧЫ ЕЎРА

Зрабілі гэта дзве непаўналетнія сястры

У Ленінскае РУУС Мінска паступіла заява ад 37-гадовага жыхара горада, які паведаміў, што з яго кватэры выкрадзена больш чым 9 тысяч еўра.

Праваахоўнікі, апытаўшы ўсіх членаў сям'і заяўніка, устанавілі, што знікненне грашовых сродкаў можа быць звязанае з сяброўкамі 11-гадовай дачкі мінчаніна — сёстрамі 14 і 16 гадоў, якія прыходзілі ў госці да дзяўчынкі.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, у ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў стала вядома, што падлеткі сапраўды датычныя да крадзяжу валюты. Цягам чатырох месяцаў дзяўчынкі наведвалі сваю сяброўку і сумесна праводзілі вольны час.

Аператыўнікам сёстры растлумачылі, што знайшлі грошы ў шафе, калі гулялі ў хованкі. Са жніўня да лістапада яны бралі адтуль невялікія сумы, аднак пасля памеры крадзяжоў сталі дасягаць 1,5 тысячы еўра за адзін раз. Такім чынам за названы перыяд падлеткі скралі 9,5 тысячы еўра.

Было ўстаноўлена, што валюту сёстры перадавалі сваёй маці, сумесна з якой у наступным трацілі яе на куплю дарагой касметыкі, парфумерыі, адзення. Пры правядзенні вобыску па месцы жыхарства мінчанак аператыўнікамі было выяўлена і канфіскавана 1,4 тысячы еўра. Каля тысячы ўмоўных адзінак знайшлі ў кашальках дзяўчынак.

За тайнае выкраданне маёмасці ў буйным памеры сёстры могуць быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, ім можа пагражаць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да сямі гадоў.

МУЖЧЫНА СКРАЎ ТАКСУ

Але сабака збег і самастойна вярнуўся дадому

Жыхарка Гродна 1950 года нараджэння падчас шопінгу ледзь не страціла свайго сабаку, аднак, у тым ліку дзякуючы супрацоўнікам міліцыі, усё скончылася добра.

Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС аблвыканкама, каля гадзіны дня жанчына прыйшла ў гандлёвы цэнтр па вуліцы Дубко. Прывязала таксу каля ўваходу ў будынак, а калі праз паўгадзіны выйшла, то ўбачыла, што гадаванец знік.

Уладальніца адразу ж паведаміла пра знікненне ў міліцыю, на працягу некалькіх гадзін выкрадзены сабака знайшоўся. Аказалася, што яго забраў мужчына 1970 года нараджэння, што праходзіў міма. Праваахоўнікі па камерах відэаназірання ўстанавілі, што грамадзянін выйшаў з тэрыторыі адной з будаўнічых арганізацый, якая знаходзіцца каля гандлёвага цэнтра, падышоў да лаўкі, дзе была прывязаная такса. Каля 15 хвілін сядзеў побач, гладзіў яе, а потым забраў. Мужчына растлумачыў, што знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення і вельмі любіць сабак яшчэ з маладосці. Яму здалося, што такса змерзла, хоць тая была ў камбінезоне. Падазраваны адвёў выкрадзенага гадаванца ў будаўнічую бытоўку, дзе адпусціў з ланцужка, а сам працягнуў распіваць спіртное.

Супрацоўнікі міліцыі да таго часу ўстанавілі, хто скраў сабаку, аднак падзеі развіваліся імкліва. У нейкі момант мужчына забыўся зачыніць дзверы, і такса збегла. Сабака добра ведаў гэты раён і самастойна вярнуўся дадому, а супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС знайшлі ў бытоўцы ў падазраванага камбінезон і ашэйнік.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БРЭСЦКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Звычайна напярэдадні юбілейных дат прынята падводзіць вынікі і гаварыць пра перспектывы. Не будзем парушаць традыцыю і цяпер. Анатоль Васілевіч, чым, на ваш погляд, можа ганарыцца Брэсцкая вобласць? Дзе яна дасягнула найлепшых вынікаў? У чым наогул асаблівасці нашай Берасцейшчыны?

— Сярод абласцей Беларусі Брэсцкая вылучаецца найбольш спрыяльнымі ўмовамі надвор'я для высокапрадукцыйнай сельскагаспадарчай вытворчасці. І гэты прыродны дар мы максімальна выкарыстоўваем. Традыцыйна з году ў год вобласць займае першыя пазіцыі ў рэспубліцы па вытворчасці прадуктаў харчавання з малака і мяса. Па экспарце сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання рэгіён таксама на першым месцы ў краіне.

Структура прамысловага комплексу накіравана на перапрацоўку мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны. Таму асноўным валаўтваральным сегментам вобласці з'яўляецца перапрацоўчая прамысловасць, у першую чаргу вытворчасць харчовых прадуктаў і напояў. Далёка за межамі вобласці і краіны любяць і ведаюць прадукцыю такіх брэндаў, як «Санта Брэмар», «Савушкін прадукт», «Брэсцкія традыцыі» і інш. Перавагу названым маркам пакупнік аддае дзякуючы іх натуральнасці і высокай якасці.

Як і ва ўсёй краіне, у нас актыўна развіваецца ІТ-галіна. На тэрыторыі рэгіёна функцыянуюць тры навукова-тэхналагічныя паркі: «Брэсцкі навукова-тэхналагічны парк», «Тэхнапарк «Палессе» ў Пінску, «Фермент» у Ляхавіцкім раёне. Рэзідэнтамі тэхнапаркаў з'яўляюцца 70 арганізацый, 54 з якіх выпускаюць прадукцыю і выконваюць работы, якія адпавядаюць V і VI тэхналагічным укладам. Брэсцкі навукова-тэхналагічны парк — найбуйнейшы суб'ект інавацыйнай структуры і галоўны бізнес-інкубатар вобласці. Парк акумулюе інавацыйна актыўныя прадпрыемствы, якія здольны падняць навуковы складнік эканомікі рэгіёна на новы ўзровень. На базе тэхнапарка створаны ўнікальны стартап-цэнтр у Брэсце, дзе любы прадпрымальнік можа атрымаць патрэбнае абсталяванне, памяшканне, інфармацыйныя і кансультацыйныя паслугі, а таксама садзейнічанне ў пошуку партнёраў, атрыманні фінансавых рэсурсаў, і абмяняцца вопытам з іншымі прадпрымальнікамі.

Да асаблівасцяў, альбо адметнасцяў, рэгіёна можна аднесці яго геаграфічнае становішча. Па тэрыторыі вобласці праходзяць два еўрапейскія аўтамабільныя транспартныя маршруты: Е30 Берлін — Варшава — Брэст — Мінск — Масква; Е85 Клайпеда — Вільнюс — Кобрын — Бухарэст — Александропаль (Грэцыя), якія звязваюць парты Балтыйскага і Міжземнага мораў. Нашы чыгуначныя магістралі злучаюць краіны Заходняй Еўропы з краінамі СНД, краіны Балтыі і Украіну. Аэрапорт Брэста мае статус міжнароднага, здольны прымаць і абслугоўваць цяжкія самалёты. Актуальным для вобласці выглядае функцыянаванне лагістычных цэнтраў, якіх у нас пяць. Працягваецца работа па развіцці трансгранічнага калідора для прасоўвання брэнда «Грузавыя саставы з Кітая ў Еўропу» ў адпаведнасці з кітайскай праграмай будаўніцтва «Эканамічнага пояса Шаўковага шляху».

Калі гаварыць пра кірункі, дзе нам трэба прыкласці большыя намаганні з выкарыстаннем пералічаных мною асаблівасцяў вобласці, то гэта, несумненна, развіццё турызму — у тым ліку медыцынскага, аздараўленчага, аграэкатурызму і іншых яго відаў. Тут ёсць пэўныя вынікі, але мы бачым нашмат большы патэнцыял, асабліва цяпер, калі атрымалі перавагі бязвізу.

— Прапаную пагаварыць пра турызм больш падрабязна. Белавежская пушча, а таксама Брэсцкая крэпасць даўно сталі брэндамі нашага рэгіёна і забяспечваюць устойлівую плынь турыстаў. Што зроблена ў апошнія гады для павелічэння патоку, якія перспектывы адкрываюцца з рэалізацыяй новаўвядзенняў у галіне турызму?

— Турыстычная індустрыя, якая сфарміравалася ў апошнія гады, спрыяе развіццю рэгіянальнай эканомікі, можна сказаць, яна — частка эканомікі. Падводзіць вынікі бягучага года пакуль рана, падчас навагодніх і зімовых канікул мы адзначаем павышэнне турыстычнай цікавасці. Але ж нават па выніках дзевяці месяцаў назіраем значны рост экспарту турыстычных паслуг. Лібералізацыя працэсу ўезду, альбо, прасцей кажучы, бязвіз, павялічыла паток турыстаў. Гэта надало імпульс развіццю гасцінічнага бізнесу. Нават на нашы аграсядзібы з адкрыццём бязвізу прыехала ў 2,6 раза больш замежных турыстаў. А ўплыў на развіццё эканомікі можна праілюстраваць такой лічбай: на створаныя прадпрыемствы ў сферы турыстычных паслуг працаўладкавана 1100 чалавек.

Мы ўжо назіраем узрастанне актыўнасці малога і сярэдняга бізнесу, пайшлі інвестыцыі ў гэтую галіну. Менавіта бязвізавы рэжым стаў імпульсам для рэалізацыі інвестыцыйнага дагавора па будаўніцтве атэля Hampton by Hilton. З яго адкрыццём Брэст стаў першым абласным цэнтрам краіны, дзе з'явіўся атэль буйнога міжнароднага брэнда.

Як вядома, 10 лістапада ўвайшоў у сілу Указ № 300, які аб'яднаў бязвізавыя тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Важным для Брэсцкай вобласці з'яўляецца магчымасць выхаду праз суседнюю Гродзенскую вобласць на турыстычныя рынкі краін Балтыі, для якіх, у сваю чаргу, адкрываецца прамы калідор у Брэст праз Белавежскую пушчу. Яшчэ ў нашых замежных гасцей з'яўляецца магчымасць не толькі пабываць у пагранічных раёнах, але і ўбачыць унікальнасць палескіх балот, наведаць старажытны Пінск, паглядзець сядзібы, палацы, музеі Івацэвіцкага, Бярозаўскага, Баранавіцкага раёнаў. Мы рыхтаваліся да рэалізацыі Указа, таму план мерапрыемстваў на найбліжэйшы час уключае будаўніцтва, рэканструкцыю і ўвод у эксплуатацыю 35 аб'ектаў турыстычнай індустрыі, правядзенне трох дзясяткаў турыстычных мерапрыемстваў, стварэнне новых турыстычных маршрутаў, сцяжын, экскурсій.

Мы заўсёды чакаем гасцей і на «Мотальскія прысмакі», і на «Спораўскія жарты» ды «Спораўскія сенакосы», якія ўжо набылі статус міжнародных, на розныя спартыўныя спаборніцтвы такога ж маштабу, культурныя мерапрыемствы. Чакаем і, спадзяюся, як след прывычаем.

— Вядома, прыезд замежнікаў на экскурсію ці адпачынак да нас спрыяе іміджу рэгіёна. І на Брэстчыне ёсць што паказаць. Не грэх згадаць, напрыклад, што клопаты па адраджэнні спадчыны пачаліся яшчэ ў канцы 80-х гадоў (Ружанскі палац), але ж асноўная работа зроблена менавіта за апошнюю чвэрць стагоддзя. Што яшчэ з вядомых аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны «стаіць у чарзе» на вяртанне нашчадкам?

— Згаданы Палацавы комплекс у Ружанах стаў гонарам як Пружанскага раёна, так і вобласці ў цэлым. Пра яго многа сказана і напісана. Там пабывалі турысты з шэрагу краін свету. Работа па рэстаўрацыі аб'екта не скончана, яна будзе працягнута з часам. Цяпер асаблівая ўвага ўдзяляецца рэстаўрацыі Косаўскага палацапаркавага ансамбля, аднаго з найпрыгажэйшых у рэгіёне. Першая чарга яго здадзеная, там працуе музей.

Вядуцца работы ў іншых раёнах вобласці. Напрыклад, на аднаўленне радавой сядзібы Напалеона Орды ва ўрочышчы Чырвоны Двор Іванаўскага раёна сёлета накіраваныя сродкі з фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва.

На тэрыторыі вобласці ёсць гісторыка-культурная каштоўнасць, якая патрабуе тэрміновых кансервацыйных мерапрыемстваў, — капліца-ўсыпальніца роду Ажэшкаў. Капліца знаходзіцца ў Закозелі Драгічынскага раёна. Не так даўно праведзены першачарговыя супрацьаварыйныя работы, вырашаецца пытанне прыцягнення сродкаў для кансервацыі ўнікальнага помніка архітэктуры.

Нашы славутасці, такія як Ружанскі палац, сядзіба Міцкевіча ў Завоссі, музейны комплекс Напалеона Орды ў Варацэвічах, нярэдка становяцца месцам правядзення свят, міжнародных творчых сустрэч, розных фестываляў.

— Цікавымі, змястоўнымі фестывалямі Брэстчына славіцца даўно. Але ж відавочна, каб была песня, трэба, каб быў хлеб. І хлеб тут — паняцце першаснае. Як вядома, наша вобласць аграрная, і ў многім карціна сацыяльна-эканамічнага развіцця абумоўлена станам і развіццём сельскагаспадарчай галіны. Думаю, ёсць сэнс нагадаць асноўныя паказчыкі работы галіны і сказаць колькі слоў пра кірункі яе развіцця.

— Гэты год для сельскагаспадарчай галіны вобласці завяршаецца з нядрэннымі вынікамі. За дзесяць месяцаў тэмп росту валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў сельгаспрадпрыемствах і сялянскіх альбо фермерскіх гаспадарках склаў 106,4 працэнта пры сярэднерэспубліканскім паказчыку 103,1 працэнта. Вытворчасць малака павялічылася на 6,7 працэнта, прадукцыя вырошчвання буйной рагатай жывёлы — на 4,1 працэнта, птушкі — на 3,9, вытворчасць яек — на 4. Гэтыя вынікі забяспечаны ў асноўным за кошт росту прадукцыйнасці жывёлы: сярэдні ўдой на карову павялічыўся на 303 кілаграмы і склаў 5134 кілаграмы, сярэднясутачная прывага буйной рагатай жывёлы падрасла на 13 грамаў і склала 664, а свіней — на 63 грамы і складае цяпер 698 грамаў.

Вобласць лідзіруе ў рэспубліцы па тэмпах росту вытворчасці малака, прадукцыі вырошчвання буйной рагатай жывёлы, сярэднім удоі на карову, прывазе цялят і свіней. Вышэйшая за сярэднерэспубліканскую атрымалася і ўраджайнасць асноўных сельгаскультур. Усё пералічанае і складае дабрабыт нашых гаспадарак, фарміруе даходы працаўнікоў вёскі. Таму для далейшага развіцця галіны планамерна абнаўляем матэрыяльна-тэхнічную базу гаспадарак, укараняем у вытворчасць сучасную тэхніку і тэхналогіі, павышаем прадукцыйнасць працы. Пералічанае дасць магчымасць нарошчваць аб'ёмы, паляпшаць якасць прадукцыі, скарачаць затраты і павялічваць выручку.

— Брэстчына мае добрыя напрацоўкі ў плане міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва. Што зроблена апошнім часам, якія праекты знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі?

— Сёння вобласць ажыццяўляе пастаўкі ў 100 краін свету. Калі, скажам, Расія, Украіна, Казахстан, некаторыя краіны Еўрасаюза з'яўляюцца нашымі даўнімі гандлёвымі партнёрамі, то важным выглядае адкрыццё новых рынкаў збыту. Апошнім часам у спіс партнёраў мы ўнеслі сем дзяржаў:

Афганістан, Бангладэш, Гвінею, Каба-Вердэ, Кот-д'Івуар, Руанду, Эль-Сальвадор. Традыцыйна вобласць утрымлівае першае месца ў рэспубліцы па аб'ёмах экспарту сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання.

Адным з прыярытэтных кірункаў па экспарце з'яўляецца развіццё супрацоўніцтва з Кітаем. З мінулага года, напрыклад, экспартныя пастаўкі ў КНР выраслі ў 1,4 раза.

У вобласці рэалізуецца цэлы шэраг буйных інвестыцыйных праектаў. Адзін з іх датычыцца вядомага вытворцы пластмасавых цацак — кобрынскага прадпрыемства «Палессе». Там будзе ўзведзены вытворча-складскі комплекс па выпуску пластмасавых вырабаў. Аўтаматызаваны складскі комплекс з'явіцца на прадпрыемстве «Санта Брэмар». З дапамогай амерыканскага інвестара ўзводзіцца прадпрыемства па вытворчасці злітка монакрышталічнага крэмнію ў Пінску. А расійскі інвестар укладвае сродкі для будаўніцтва ўчастка ліцця прадпрыемства «Брэстгазаапарат». У Баранавічах узводзіцца прадпрыемства па вырошчванні грыбоў, а ў Брэсце ААТ «Эполь Софт» вядзе будаўніцтва офіснага памяшкання для размяшчэння прадпрыемства сферы высокіх тэхналогій.

— Згаданыя вамі Пінск і Баранавічы ўвайшлі ў спіс гарадоў з паскораным сацыяльна-эканамічным развіццём. Што зроблена там і як будуць развівацца астатнія райцэнтры?

— У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта краіны распрацаваны комплексныя планы па развіцці названых гарадоў. Варта сказаць, што ў Баранавічах і Пінску нямала зроблена за мінулы і бягучы

НАПРАМАК

гады. Цяпер у Баранавічах рэалізуецца 19 асноўных інвестыцыйных праектаў, 14 з іх з'яўляюцца прыярытэтнымі. На стадыі падрыхтоўкі яшчэ 16 праектаў. Баранавічы — прамысловы горад, таму асаблівая ўвага ўдзяляецца перааснашчэнню і мадэрнізацыі прамысловасці.

Дзякуючы ўкараненню тэхналогіі лічбавага друку на баваўнянай тканіне Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне ўжо прыступіла да выпуску інавацыйнай прадукцыі. Цяпер найбуйнейшы вытворца тэкстыльнай прадукцыі ў Еўропе і краінах СНД мае поўны цыкл вытворчасці: ад перапрацоўкі бавоўны да выпуску гатовых швейных вырабаў. А росту цікавасці да прадукцыі пад маркай «Блакіт» на айчынных і замежных рынках паспрыяла рэалізацыя названага праекта.

На завяршальнай стадыі праект з прыцягненнем сродкаў інавацыйнага фонду аблвыканкама, які рэалізуецца на Баранавіцкім заводзе станкапрылад па арганізацыі вытворчасці самацэнтруючых такарных патронаў для высокатэхналагічнага металаапрацоўчага абсталявання. Пачатак вытворчасці запланаваны на снежань гэтага года. Ідзе падрыхтоўка двух інавацыйных праектаў на станкабудаўнічым заводзе, які з'яўляецца філіялам закрытага акцыянернага таварыства «Атлант».

Прамысловыя прадпрыемствы Пінска рэалізуюць цяпер сем буйных праектаў. Закрытае акцыянернае таварыства «Амкадор-Пінск» асвойвае вытворчасць інавацыйнай прадукцыі, славуты «Пінскдрэў» ажыццяўляе два праекты па мадэрнізацыі фанернай вытворчасці з укараненнем энергакомплексу, ААТ «Кузлітмаш» наладжвае вытворчасць базавых вузлоў электрычных машын. Пінскія трыкатажнікі (ААТ «Палессе») летась рэалізавалі два праекты, цяпер яны выпускаюць інавацыйныя бясшоўныя вырабы і робяць новыя віды пражы фантазійнай структуры.

Разам з мадэрнізацыяй прадпрыемстваў развіваецца сацыяльная інфраструктура гарадоў. У Баранавічах і Пінску сваіх выхаванцаў прынялі новыя дзіцячыя садкі на 240 месцаў, завяршылася рэканструкцыя вакзала Баранавічы-Палескія. Важным кірункам дзейнасці бачыцца прыцягненне ў гаспадарчы абарот аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца. Цяпер на 21 з 23 індустрыяльных пляцовак, што сфарміраваны на базе такіх аб'ектаў у Баранавічах, з'явіліся новыя ўласнікі. На іх ажыццяўляюць дзейнасць 27 прадпрыемстваў з агульнай колькасцю занятых больш за 200 чалавек. У далейшым плануецца павялічыць колькасць рабочых месцаў яшчэ на 100. Новыя гаспадары арганізавалі розныя віды дзейнасці ў сферы вытворчасці прадукцыі і аказання паслуг.

У цэлым за гэты час у Баранавічах створана 57 новых мікраарганізацый і малых арганізацый, у Пінску — 54.

Апошнім часам вялікая ўвага ўдзяляецца скарачэнню міжрэгіянальнай дыферэнцыяцыі ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. У першую чаргу актыўныя меры прымаюцца ў адносінах да рэгіёнаў, якія Мінэканомікі аднесла да адстаючых па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гаворка ідзе пра Ганцавіцкі, Драгічынскі, Маларыцкі раёны. І калі для ўсіх рэгіёнаў вобласці распрацаваны праграмы, якія ўмоўна назвалі Планамі індустрыялізацыі, то для названых раёнаў ёсць планы асобныя. Гэта комплекс мер па стварэнні ўмоў устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Драгічынскага і Ляхавіцкага раёнаў, комплексны план развіцця Маларыцкага раёна, стратэгія развіцця Ганцавіцкага раёна.

Анатоль ЛІС віншуе Таццяну ХАЛАДОВІЧ з перамогай на II Еўрапейскіх гульнях.

Аблвыканкам лічыць сваёй задачай стымуляваць і падтрымліваць інвестыцыйную актыўнасць у рэгіёнах, асабліва тых праектаў, якія забяспечваюць стварэнне новых высокатэхналагічных вытворчасцяў. Пад іх выдзяляюцца сродкі з абласнога інавацыйнага фонду. На сённяшні дзень у вобласці заключаны 262 інвестыцыйныя дагаворы на суму больш за два мільярды рублёў.

Варта сказаць, што для большасці райцэнтраў характэрная актыўная інвестыцыйная дзейнасць. Апошнім часам паспяхова мадэрнізуюцца прадпрыемствы мяса-малочнай галіны. Яны ўлічваюць змяненне попыту, кан'юнктуры рынкаў, падыходаў у галіне якасці і пастаянна вядуць работу па тэхнічным пераўзбраенні вытворчасці. Ужо сёлета здзейснены шэраг буйных праектаў, у тым ліку на Лунінецкім малочным заводзе, на Пружанскім малочным заводзе і іншых прадпрыемствах. Закуплена абсталяванне па выпуску дзіцячага харчавання ў шкляной тары на Маларыцкім кансерваваагароднінасушыльным камбінаце.

Развіваецца мэблевая прамысловасць у раёнах. На арэндных плошчах ААТ «Івацэвічдрэў» замежным прадпрыемствам арганізавана новая вытворчасць мэблі. Створана 240 рабочых месцаў. Уся прадукцыя экспартуецца ў Германію. Варта сказаць, што і ў Жабінцы паспяхова ажыццёўлены немалы праект. Фірмай «Консул» тут узведзены завод па вытворчасці прэміксаў, суперканцэнтратаў і камбікармоў для маладняку сельскагаспадарчай жывёлы. Створана 46 рабочых месцаў, за дзесяць месяцаў выпушчана прадукцыі на суму каля 3,5 мільёна рублёў.

Для нас ужо прывычнымі сталі цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва, інкубатары малога бізнесу. Яны праводзяць інфармацыйна-тлумачальную работу, аказваюць фінансавую падтрымку пачаткоўцам. І гэта дае свае вынікі. Толькі за 10 месяцаў гэтага года па вобласці створана 650 мікра- і малых арганізацый, у тым ліку ў раённых цэнтрах. У той жа Жабінцы адкрыта будаўнічае прадпрыемства. На работу прынята 28 чалавек. У планах — экспарт будаўнічых паслуг у Польшчу. У Кобрыне зарэгістраванае прадпрыемства па вытворчасці зборных жалезабетонных канструкцый з 10 рабочымі месцамі, у Мікашэвічах дзевяць чалавек сталі займацца здабычай каменю для будаўнічых работ. Спіс можна доўжыць.

Ствараць новыя вытворчасці, рабочыя месцы — задачы першай чаргі. Але не менш важным выглядае клапаціцца пра знешні выгляд населеных пунктаў, асабліва райцэнтраў, камфорт іх жыхароў. Хто не так даўно заязджаў у нашы гарады, абавязкова заўважыць гэты клопат. Пастаянна вядуцца работы па добраўпарадкаванні тэрыторый, рамонт дарог, пасадка дрэў і рэканструкцыя газонаў, абуладкаванне і рамонт спартыўных і дзіцячых гульнявых пляцовак у раёне жылой забудовы. І трэба сказаць, што ў большасці рэгіёнаў вобласці, у тым ліку ў адстаючых, сёлета назіраецца істотнае нарошчванне аб'ёмаў прамысловай вытворчасці, экспарту тавараў, паляпшэнне фінансавых паказчыкаў дзейнасці арганізацый.

— Хацелася б пагаварыць пра тое, як падтрымліваецца малы бізнес, прыватная ініцыятыва грамадзян, асабліва жыхароў пасёлкаў, былых райцэнтраў, вёсак. Як зрабіць, каб і там з'яўлялася больш прадпрыемстваў, станавілася больш рабочых месцаў?

— Пачнём з таго, што ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016—2020 гады з пачатку бягучага года дадзены льготныя крэдыты за кошт сродкаў абласнога бюджэту 13 суб'ектам малога прадпрымальніцтва з рэгіёнаў на суму 708 тысяч рублёў. Гэтыя прадпрыемствы плануюць адкрыць 41 рабочае месца. Усяго ж сёлета на аказанне дзяржаўнай фінансавай дапамогі суб'ектам малога прадпрымальніцтва будзе накіравана 2,6 мільёна рублёў. Налета плануецца накіраваць 2,9 мільёна. У апошнія гады Брэстчына выглядае лідарам у краіне ў частцы фінансавай падтрымкі малога прадпрымальніцтва.

Сёння ў вобласці ёсць 78 зямельных участкаў — іх можна назваць таксама індустрыяльнымі пляцоўкамі з інжынернай і транспартнай інфраструктурай для размяшчэння на іх аб'ектаў па вытворчасці тавараў альбо аказання паслуг. Ёсць магчымасць набываць маёмасць, якая не выкарыстоўваецца. Пракансультаваць, падказаць, дапамагчы на самым пачатку могуць у цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва, якіх дзейнічае 12. Значыць, для адкрыцця новага прадпрыемства альбо віду дзейнасці ўсё ёсць, патрэбны толькі жаданне і ўласная ініцыятыва.

І яшчэ. Органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне выдаюць субсідыі для арганізацыі сваёй справы беспрацоўным грамадзянам. Такую дапамогу толькі сёлета атрымалі 153 чалавекі.

Акрамя таго, прадпрымальніцкую ініцыятыву жыхары невялікіх гарадоў і сельскай мясцовасці цяпер могуць рэалізаваць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка альбо юрыдычнай асобы пры ўмовах уплаты адзінага падатку. Цяпер без лішніх фармальнасцяў можна прадаваць печыва, шыць адзенне, рамантаваць мэблю, абутак, аказваць шэраг паслуг, чым і займаецца больш за восем тысяч чалавек. Варта адзначыць, што расце колькасць рамеснікаў, у тым ліку ў сельскай мясцовасці.

— Жыццё аграгарадкоў, вёсак у многім абумоўлена добраўпарадкаваннем населенага пункта, станам дарог, наяўнасцю аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння. У нас зроблена, несумненна, шмат у гэтым кірунку. Якія перспектывы, што запланавана ў найбліжэйшы час?

— Цяпер у вобласці налічваецца 222 аграгарадкі. Іх развіццё ідзе ў адпаведнасці з планам, які распрацаваны на перыяд з 2017 да 2020 года. Асноўнымі яго мерапрыемствамі з'яўляюцца капітальны рамонт жылога фонду, добраўпарадкаванне дваравых тэрыторый, мадэрнізацыя цеплавых сетак, асфальтаванне дарог, будаўніцтва станцый абезжалезвання, газіфікацыя жылога фонду — адным словам, паступова робіцца ўсё, з чаго складаецца якасць жыцця сельскага чалавека. Скажам, на сучасным этапе пра гэтую якасць нельга ўжо гаварыць без магчымасці атрымання паслугі шырокапалоснага доступу ў сетку Інтэрнэт. Цяпер ідзе работа па ўкараненні такога сацыяльнага стандарту для населеных пунктаў з насельніцтвам 300 чалавек і вышэй. Калі нашы аграгарадкі атрымаюць указаную хуткасць інтэрнэту, можна будзе сказаць, што ўмовы іх жыцця не адрозніваюцца ад гарадскіх.

І яшчэ адно вельмі важнае пытанне, якое людзі найчасцей закранаюць падчас прамых ліній, выязных прыёмаў, у лістах і вусных зваротах, — стан дарог. Дарога ўяўляецца важнай для кожнага. Работа ў гэтым кірунку вядзецца пастаянна. За дзевяць месяцаў гэтага года адрамантавана амаль 229 кіламетраў дарог агульнага карыстання, на 15,7 кіламетра праведзены капітальны рамонт. Налета плануецца адрамантаваць 324,8 кіламетра дарог, у тым ліку 45,1 капітальным рамонтам.

— Ва ўсе часы і эпохі розныя гарады, краіны, асобныя рэгіёны праслаўлялі людзі: працаўнікі, асобы, дзеячы. Каго, на ваш погляд, можна згадаць напярэдадні 80-гадовага юбілею Брэстчыны, хто быў альбо з'яўляецца гонарам рэгіёна?

— Калі мы кажам, што Брэстчына вядомая многімі аб'ектамі, славутасцямі, добрымі справамі, то маем на ўвазе, што галоўныя іх стваральнікі і захавальнікі — людзі з іх працавітасцю, ініцыятывай, жаданнем зрабіць свой край лепшым. Каб назваць усіх альбо нават многіх, хто праславіў наш край, пачынаючы з папярэдніх эпох, ды дадаць герояў вайны і працы, лепшых працаўнікоў усіх без выключэння галін народнай гаспадаркі, спатрэбіцца цэлы нумар газеты. А можа, і не адзін. Таму напярэдадні юбілею варта будзе згадаць ганаровых грамадзян вобласці, якія ўдастоены гэтага звання за канкрэтныя справы і заслугі. У іх ліку двойчы Герой Сацыялістычнай Працы былы старшыня калгаса «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна Уладзімір Бядуля; двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт Пётр Клімук; былыя кіраўнікі вобласці Яфрэм Сакалоў, Анатоль Зеляноўскі, Віктар Бурскі; Герой Беларусі, былы кіраўнік Брэстаблсельбуда, былы старшыня праўлення Нацбанка краіны Пётр Пракаповіч; былы намеснік старшыні Саўміна БССР, які курыраваў узвядзенне мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», Аляксандр Кічкайла; алімпійскія чэмпіёны Сяргей Макаранка і Юлія Несцярэнка; прафесар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Марыя Осіпава; архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан — Ігар Корзун. Спіс гэты адкрыты, ён будзе папаўняцца новымі асобамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Продавец ОАО «Витебскоблавтотранс», 210001, Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11, тел. (0212) 68-73-41

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-75167, площадью 2440,7 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 18, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание АВИА-ТЭЧ № 219, составные части и принадлежности: крыльца, проезжая часть: участок 1, участок 2, участок 3, водопровод ввода, канализационная сеть. Многолетние насаждения: рябина, осина, клен, ели голубые, березы, всего – 30 шт. Передаточные устройства – распредустройство на 10 кВ, 1983 г. в., инв. № 3653, распредустройство на 0,4 кВ, 1986 г. в., инв. № 3654, трансформатор силовой масляный 400 кВА ТТ 400/10, 1983 г. в., инв. № 3652. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 221200000001001042, площадью 0,9429 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 18 с целевым назначением – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Обременение: договор аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей № Дг10-252-А от 19.10.2018 сроком по 18.10.2021 г. (временное возмездное владение и пользование частью кровли здания АВИА-ТЭЧ № 219, площадью 121,0 кв. м).
Нач. цена: 129 194,40 бел. руб., в т. ч. НДС. **Задаток**: 12 919,44 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 16.12.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 04.12.2019 по 13.12.2019. **Условия аукциона**: победитель аукциона (единственный участник) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней возместить затраты за организацию и проведение аукциона; в течение 10 (десяти) рабочих дней возместить затраты на проведение независимой оценки в размере 987,12 бел. руб., в т. ч. НДС; подписать договор купли-продажи не позднее 10 календарных дней с момента объявления итогов аукциона; оплатить предмет торгов не позднее 10 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. **Задаток перечисляется на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 05.10.2019, 19.11.2019

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Осмотр объекта осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 3463401.

ОАО «Лидапищеконцентраты»

сообщает, что 12 декабря 2019 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров

Место нахождения общества: г. Лида, ул. Тавлая, 11.

Место проведения собрания: помещение актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. «Об избрании членов ревизионной комиссии общества».

Акционеры (их представители) имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания в рабочие дни с 2 декабря 2019 года с 8.00 до 17.00. по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11 (приемная секретаря руководителя), а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет. УНП 500021268

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Универмаг «Солигорск» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

здание склада с инв. № 644/С-3267 общей площадью 846,6 кв. м и ограждение железобетонное с инв. № по бух. учету 2Б, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625000000012000035 площадью 0,1888 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район станции «Калий – 1».

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 83 616,00 бел. руб.**

Начальная цена снижена на 20 %. Задаток 10 % от начальной цены **(8 361,60 бел. руб.).**

Установлены типовые условия продажи объекта:

– в случае отсутствия необходимости изготовления проектно-сметной документации:

в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект проинформировать Солигорский районный исполнительный комитет об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

обеспечить безопасность и ограничение доступа на Объект с момента подписания акта о приеме-передаче;

навести на земельном участке, отведенном для обслуживания Объекта, порядок в течение одного месяца с момента подписания сторонами акта о приеме-передаче;

привести Объект в надлежащее санитарное, техническое состояние в течение двенадцати месяцев с момента подписания акта о приеме-передаче;

– в случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектно-сметной документации (проектирование, возведение, реконструкция, реставрация, капитальный ремонт, благоустройство либо снос):

обратиться в Солигорский районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ не позднее шести месяцев с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект;

начать разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в течение одного месяца с даты получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

осуществить реконструкцию (строительство), реставрацию, капитальный ремонт, благоустройство либо снос Объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, если иное не установлено решением Солигорского районного исполнительного комитета;

обеспечить безопасность и ограничение доступа на Объект с момента подписания акта о приеме-передаче;

– использовать земельный участок в соответствии с действующим законодательством;

– поддерживать надлежащее санитарное, техническое состояние Объекта и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) Объекта до его сноса (гибели);

– запрет на отчуждение Объекта до выполнения Покупателем условий договора купли-продажи (за исключением случаев отчуждения, передачи без перехода права собственности объекта Покупателем, являющимся физическим лицом, созданному им субъекту хозяйствования, либо использования объекта при регистрации физического лица в качестве индивидуального предпринимателя);

– по требованию Продавца представлять письменную информацию о выполнении обязательств и условий договора купли-продажи (с подтверждающими документами, фотоматериалами), а также возможность обследования Продавцом Объекта для проверки представленной информации.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 30.03.2019, 01.06.2019 и 05.09.2019.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **10.01.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.01.2020** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 600024725

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества Коммунальное производственное дочернее унитарное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

Лот, №	Наименование	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона без НДС, бел. руб.
1	Автомобиль GAZ-32213 (рег. знак АК 0737-5)	5760,00	576,00	288,00
2	Автомобиль MAZ 437143 (рег. знак АО 8117-5)	5120,00	512,00	256,00
3	Автомобиль MAZ 6303A8 (рег. знак АР 1291-5)	28160,00	2816,00	1408,00
4	Прицеп MAZ 837810-022 (рег. знак А 9455 В-5)	5280,00	528,00	264,00
5	Кран башенный, в т. ч. подкрановый путь (две нитки по 37 м), инв. № 861	12690,00	1269,00	634,50
6	Станок строгальный 4-х, инв. № 880	4680,00	468,00	234,00
7	Пилорама Р63 4 Б, инв. № 901	4500,00	450,00	225,00
8	Станок угло-зачист. СА-606, инв. № 1532	2430,00	243,00	121,50
9	Машина двухгол. DK 502, инв. № 1533	4680,00	468,00	234,00
10	Стол для раскроя стекла, инв. № 1576	18900,00	1890,00	945,00
11	Пила для резки дистанц. проф., инв. № 1577	3150,00	315,00	157,50
12	Экструдер гидравлический, инв. № 1578	29520,00	2952,00	1476,00
13	Оборудование для засыпки сита, инв. № 1579	2790,00	279,00	139,50
14	Кондиционер для охлаждения, инв. № 1581	5130,00	513,00	256,50
15	Бутилэкструдер 7,5 кг, инв. № 1582	14130,00	1413,00	706,50
16	Авт. линия для производства стеклопакетов, инв. № 1583	53820,00	5382,00	2691,00
17	Электропневматический стол, инв. № 1584	3960,00	396,00	198,00
18	Двухголовочная пила, инв. № 1550	7200,00	720,00	360,00
19	Пресс ZPX 14378, инв. № 1572	2700,00	270,00	135,00

Лоты расположены по адресу: **Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, 73**

В отношении лотов №№ 1–4 проводятся вторые повторные торги (цена снижена на 20 %). В отношении лотов №№ 5–19 проводятся первые повторные торги (цена снижена на 10 %). Окончание приема заявлений в 18.00 18.12.2019

Предыдущие торги по лотам №№ 1–4 проводились 14.10.2019 и 11.11.2019, а по лотам №№ 5–19 торги проводились 12.11.2019, публикации о проведении торгов были размещены на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве объявление № 00043262 от 12.09.2019 г. **(https://bankrot.gov.by/Messages/MessageItem/43262)**, объявление № 00044308 от 09.10.2019 г. **(https://bankrot.gov.by/Messages/MessageItem/44308),** объявление № 00044987 от 25.10.2019 г. **(https://bankrot.gov.by/Messages/MessageItem/44987).**

Также иную информацию касательно торгов можно узнать на сайте организатора торгов: **https://orgtorg.by**

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 5 % от начальной цены предмета торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Дополнительные условия: все мероприятия, связанные со снятием имущество с учета, осуществляет Покупатель собственными силами и за свой счет.

Аукцион состоится 19.12.2019 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info**

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества КУП «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» (Лот №__), проводимом __.__.2019 г.»

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Шишонок Андрей Николаевич, тел. 8 (029) 703 25 71.

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Организатор аукциона	ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: frondera@mail.ru • сайт https://orgtorg.by
Продавец	Коммунальное производственное дочернее унитарное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ» ☎ 8 (017) 395-81-34, 8 (017) 395-89-17, 8 (029) 392-89-06

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Ростэм»

Лот, №	Наименование	Местонахождение	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона без НДС, бел. руб.
1	Доля в уставном фонде Общества с ограниченной ответственностью «Агрофирма Илья» в размере 100 %	Минская область, Вилейский р-н, д. Ободовцы	6 916 000,00	691 600,00	345 800,00

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» 02.10.2019 г. №187, стр. 10.

Окончание приема заявлений в 18.00 18.12.2019

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 0,75 % от начальной цены предмета торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 20.12.2019 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Ростэм» (Лот №__), проводимом __.__.2019 г.»

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра **Лота № 1**: +375 (44) 759-42-67, Михаловский Эдуард Михайлович.

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Организатор аукциона	ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: frondera@mail.ru
Продавец	ЗАО «Ростэм» в лице антикризисного управляющего ООО «Центр финансового оздоровления «Партнер-Консультант» ☎ 8 (029) 365-06-97

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующим Николаева Владимира Владимировича, 13.09.1972 года рождения, проживавшего по адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Середина, д. 4, кв. 9.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2 месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Николаеве Владимире Владимировиче.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Стоп-вірус

ВЕДАЙ СВОЙ СТАТУС!

Ці ўдасца пакласці канец распаўсюджванню ВІЧ-інфекцыі?

Згодна са звесткамі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, больш за 37 мільёнаў чалавек на планеце жыве з ВІЧ-інфекцыяй. Каля 32 мільёнаў памерла ад прычын, звязаных з «чумой XX стагоддзя». Першыя выпадкі гэтага захворвання ў свеце зафіксаваны медыкамі ў канцы 60-х, хоць лічыцца, што першы мужчына памёр ад яго ў 1959 годзе ў Конга. На тэрыторыі Беларусі ВІЧ з'явіўся ў 1986 годзе. Доўгі час інфекцыя лічылася невылечнай. І толькі ў 2000-х пацыентаў пачалі лячыць з выкарыстаннем АРВ-тэрапіі. Прыём гэтых прэпаратаў зніжае вірусную нагрузку да невызначальнага ўзроўню, такі чалавек не ўяўляе небяспекі, бо не перадае інфекцыю. А галоўнае, працягласць жыцця людзей, якія пастаянна прымаюць АРВ-прэпараты, такая ж, як і ва ўсіх астатніх. Як жывуць і лечацца ў нашай краіне людзі з ВІЧ, расказалі спецыялісты.

ПРАБЛЕМА З 90-Х

— Сапраўдная праблема ўзнікла ў нашай краіне ў сярэдзіне 90-х. Першыя рэгіёны, пра якія ўсім вядома (у прыватнасці, Светлагорск Гомельскай вобласці. — **«Зв.»**), былі адметныя павышанай захваральнасцю. У пачатку 2000-х пачалося лячэнне ВІЧ-інфекцыі з прымяненнем АРВ-тэрапіі. Першая статыстыка такіх пацыентаў абнадзейвала. З таго часу з'явіліся новыя групы АРВ-прэпаратаў, якія дазваляюць хворым жыць паўнавартасным жыццём, — расказвае **галоўны пазаштатны інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя, загадчык кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ Ігар КАРПАЎ.**

З моманту пастаноўкі першага дыягназу ВІЧ-інфекцыі ў Беларусі было выяўлена 28,7 тысячы хворых, больш за 21,8 тысячы жыве з хваробай сёння. Захваральнасць складае 230 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, або 0,2 %.

— Захваральнасць на ВІЧ звыш 1 % лічыцца высокай. Напрыклад, у Санкт-Пецярбургу інфікавана больш за 2 % насельніцтва. У нас захворванне кантралюецца, — каментуе статыстыку **намеснік галоўнага ўрача Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Мінска Алег СКРЫПКО.** — Найбольш распаўсюджаны ВІЧ у Гомельскай вобласці, дзе высокім было наркаспажыванне. Найменш на Гродзеншчыне — усяго 0,088 %. Трохі больш у Брэсцкай і Віцебскай абласцях. Магчыма, гэта звязана з тым, што ў заходніх рэгіёнах распаўсюджана каталіцтва з моцнымі сямейнымі ўстоямі.

СЯРЭДНІ ЎЗРОСТ ХВОРЫХ — 37 ГАДОЎ

Дарэчы, парэнтэральны (праз увядзенне прэпаратаў унутрывенна) шлях перадачы ВІЧ у Беларусі выйшаў на другое месца. На першым — палавы шлях. Сёлета ў краіне зафіксавана 1769 новых выпадкаў. Гэта на 9 % менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. 70 % хворых — мужчыны, сярэдні ўзрост пацыентаў — 37 гадоў.

— Яшчэ 5-7 гадоў таму парэнтэральны шлях перадачы быў на першым месцы. Цяпер гэтае захворванне можа з'явіцца ў любога чалавека. Сёння нашы пацыенты — звычайныя, сацыялізаваныя людзі, а не наркаманы, — адзначае Алег Скрыпко.

Дарэчы, колькасць новых выпадкаў ВІЧ у свеце ў апошнія гады зніжаецца. А вось у рэгіёне Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі сітуацыя адваротная. Таму важным у прафілактыцы з'яўляецца прыём АРВ-тэрапіі: калі вірус падаўляецца прэпаратамі, то ён і не перадаецца.

У сувязі з гэтым Беларусь далучылася да стратэгіі 90-90-90 — лячэнне для ўсіх (90 % хворых ведаюць пра свой дыягназ, 90 % з іх



прымаюць АРВ-тэрапію, і, адпаведна, у 90 % з іх пад уздзеяннем лекавых сродкаў вірус падаўляецца да невызначальнага ўзроўню) — і прыняла абавязацельствы да 2030 года пакласці канец распаўсюджванню інфекцыі. З 2018 года ў нашай краіне ўніверсальны доступ да АРВ-лячэння. Гэта значыць, што кожнаму, хто мае ВІЧ-інфекцыю, а таксама адразу пры пастаноўцы такога дыягназу прапануюць лячэнне.

— Калі раней лячэнне было магчымае толькі тады, калі надыходзіла пэўная ступень падаўлення імунітэту, то цяпер іншы падыход: чым хутчэй яно пачнецца, тым лепш, — кажа Алег Скрыпко.

Пакуль лічбаў 90-90-90 дасягнуць не ўдалося, але мэта блізкая. У прыватнасці, па падліках медыкаў, у нас 83,9 % хворых на ВІЧ ведаюць свой дыягназ. З іх 80,4 % прымаюць АРВ-тэрапію. У 75,7 % дасягаецца невызначальная вірусная нагрузка.

— Многія нашы пацыенты знаходзяцца ў сістэме дэпартамента выканання пакарання, узяты на лячэнне нядаўна і не дасягнулі чаканага паказчыка, таму трэцяя лічба ў нас пакуль невысокая. Але сусветныя лічбы ніжэйшыя, чым у нас, — 79-76-73. Хоць і там у залежнасці ад рэгіёна яны розняцца. Найлепшая сітуацыя ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе, а таксама ў Паўночнай Амерыцы. Там амаль усе краіны дасягнулі 90-90-90. Усходняя Еўропа і Цэнтральная Азія, на жаль, пакуль застаюцца крыніцай і рэзервуарам ВІЧ-Інфекцыі, — канстатуе Алег Скрыпко.

КОЖНЫ ПЯТЫ НЕ ВЕДАЕ

Нягледзячы на станоўчыя змены, Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць малаімаверным спыненне распаўсюджвання ВІЧ у рэгіёне Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі да 2030 года. Паводле звестак арганізацыі, кожны пяты хворы тут не ведае пра свой статус.

— ВІЧ найбольш распаўсюджаны ў ключавых групах. Хворыя — сацыяльна ўразлівыя людзі. Таму неабходна спрашчэнне тэсціравання: мы прапануем адмовіцца ад існуючых сістэм і перайсці да больш простых. Тэсты павінны праводзіцца хутчэй і танней. Важна, каб пацыент атрымліваў вынік на працягу некалькіх гадзін, а не тыдняў, — адзначае **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ.**

У ліку мегаполісаў, якія наблізіліся да лічбаў 90-90-90, Лондан, Амстэрдам, Нью-Ёрк, Мельбурн, Парыж. Мінск на іх фоне таксама выглядае нядрэнна, і да дасягнення паказчыкаў стратэгіі «Лячэнне для ўсіх» засталося няшмат. У Мінску, дарэчы, на базе Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы носьбітам ВІЧ аказваюцца два віды дапамогі. Амбулаторную атрымліваюць у кансультатыўным аддзеле. Тут пацыенты знаходзяцца на дыспансерным уліку, ім выдаюць прэпараты і кантралююць лячэнне. Цяжкіх пацыентаў шпіталізуюць у аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыю.

НЕДАПРАЦОЎКА ПАЛІКЛІНІК

Нягледзячы на дасягненні, праблемай застаецца позняе выяўленне ВІЧ — на 3-й і 4-й стадыях. Сёлета ў Мінску такі дыягназ пастаўлены 90 хворым.

— У 20—25 % інфекцыя выяўляецца на позніх стадыях. Гэта патэнцыйныя хворыя з інваліднасцю. І выяўленне на такіх этапах — недапрацоўка нашых паліклінік, — лічыць Алег Скрыпко.

Менавіта такія цяжкія пацыенты знаходзяцца пад апекай сясцёр міласэрнасці Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. З пачатку года яны клапаціліся пра 53 хворых у тэрмінальнай стадыі, шэсць з іх пайшлі з жыцця. Сярод падапечных — Алена з Бабруйска. Пасля 10 гадоў ужывання наркотыкаў дзяўчына ўпала ў кому. «Самы страшны дзень у нашым жыцці здарыўся ў 2006 годзе. Спачатку ў дачкі нібыта забалела вуха. Мы тройчы за ноч выклікалі хуткую, а потым надышла кома — 21 дзень. Сто дзён яна правяла ў рэанімацыі», — кажа яе маці.

Пасля гэтага маладая жанчына наноў вучылася хадзіць. Сёння яна вымаўляе тры словы і нават імкнецца дапамагаць маці па доме. Таварыства Чырвонага Крыжа зняло пра Алену і яе сям'ю дакументальны фільм — як напамін усім: спыніцца, пакуль не позна, і даведацца пра свой ВІЧ-статус.

Скажыце, доктар...

ЧЫМ ЗАМЯНІЦЬ ЦУКАР

і ці варта гэта рабіць?

Гісторыя цукразамяняльнікаў пачалася ў 1879 годзе, калі ў лабараторыі амерыканскага прафесара Рэмсена хімік Фальберг праводзіў свае эксперыменты. Аднойчы падчас абеду ён звярнуў увагу на незвычайны смак хлеба — той здаўся яму занадта салодкім. Але прысутныя ніякай салодкасці не адчувалі. Тады Фальберг зразумеў, што салодкі не хлеб, а яго пальцы: перад абедам ён займаўся з прэпаратам са складанай назвай «сульфамінбензойная кіслата». Вынаходца памчаў у лабараторыю праверыць здагадку, і яна пацвердзілася: злучэнні сульфамінбензойнай кіслаты сапраўды былі дзівосна салодкія. Так быў сінтэзаваны сахарын. Рэчыва з такімі ўласцівасцямі хутка знайшло прымяненне: падчас Першай сусветнай вайны цукру катастрафічна не хапала. У пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя Наркамздраў дазволіў выраблять сахарын і ў СССР.

Прайшоў час, і праз больш чым стагоддзе пасля выпадковага адкрыцця Фальберга попыт на падсалоджвальнікі стаў вялікі як ніколі. Многія цукразамяняльнікі не маюць энергетычнай каштоўнасці, да таго ж вельмі эканамічныя: адзін пластыкавы кантэйнер можа замяніць ад 6 да 12 кілаграмаў цукровага пяску. Але, нягледзячы на гэта, імі не варта захапляцца. Чаму гэтага не трэба рабіць, расказала **загадчык аддзела гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кацярына СУХАВЕР.**

— Усе замяняльнікі цукру можна ўмоўна раздзяліць на дзве групы: натуральныя і сінтэтычныя. Натуральныя — а гэта фруктоза, сарбіт, ксіліт — цалкам засвойваюцца арганізмам і, як і звычайны цукар, забяспечваюць чалавека энергіяй. Яны бяспечныя, але, на жаль, каларыйныя, — тлумачыць Кацярына Сухавер. — Большасць сінтэтычных замяняльнікаў (сахарын, цыкламат, аспартам, ацэсульфам калія, сукразіт) энергетычнай каштоўнасці не маюць і не засвойваюцца арганізмам. Але згадайце, які апетыт у вас разыгрываецца пасля таго, як вы выпіваеце бутэльку нізкакаларыйнай колы ці праглынаеце 2-3 «дыетычныя» дражэ. Адчуўшы салодкі смак, страўнікава-кішачны тракт рыхтуецца да атрымання вугляводаў. Але мы адправілі ў яго нуль калорый. І арганізм у даўгу не застанецца, і любы вуглявод, які трапляе ў страўнік на працягу сутак пасля гэтага, выклікае нязвыклае пачуццё голаду.

Давайце разгледзім варыянты, якія нам прапануюць замест цукру.

Нектар агавы. Гэта самы свежы на сённяшні дзень замяняльнік ад індустрыі здаровага харчавання. Ён вырабляецца з кактуса і так апрацаваны і ачышчаны, што ўтрымлівае вялікую колькасць фруктозы (90 %) і 10 % глюкозы. Акрамя таго, працэс стварэння гэтага сродку аналагічны працэсу сінтэзу кукурузнага сіропу з высокім утрыманнем салодкага рэчыва.

Аспартам. Вядома, што 90 % дыетычных газіраваных напояў і нават некаторыя сокі ўтрымліваюць аспартам — альтэрнатыву цукру, створаную ў лабараторыі. І гэтым рэчывам таксама не варта злоўжываць, бо яно спрыяе набору лішняй вагі. У некаторых даследаваннях выяўляецца сувязь аспартаму і анкалагічных хвароб. Вучоныя сыходзяцца на тым, што неабходны дадатковыя даследаванні ў гэтай галіне.

Сукралоза — штучны падсалоджвальнік, які не з'яўляецца каларыйным, таму што арганізм з усіх сіл імкнецца яго расшчапіць. Сукралоза прыблізна ў 600 разоў саладзейшая за сахарозу (сталовы цукар) і можа ўжывацца ў меншай колькасці. Яна ўтрымліваецца ў такіх прадуктах, як пратэінавыя парашкі. Спрэчкі наконт шкоды і карысці сукралозы не сціхлі дагэтуль, бо ў склад гэтага падсалоджвальніку ўваходзіць хлор.

Стэвія — натуральны раслінны экстракт, які прымяняюць у праграмах пахудзення. Акрамя паскоранага спальвання тлушчу, ён нармалізуе ціск, станоўча ўплывае на работу розных органаў. Даследаванні не выявілі пабочных эфектаў ад працяглага ўжывання стэвіі. Аднак нават тым, каго не палохае горкі прысмак, не варта перавышаць сутачную норму ўжывання.

Сарбіт — другая разнавіднасць натуральных падсалоджвальнікаў. Смакам ён нагадвае цукар, але не адносіцца да вугляводаў, таму не ўплывае на выпрацоўку інсуліну. У гэтым галоўная яго вартасць. Ужыванне больш за 30 грамаў сарбіту за адзін прыём прыгнятае дзейнасць страўнікава-кішачнага тракту, у рэдкіх выпадках выклікае халецыстыт.

Сахарын — штучны аналаг цукру, саладзейшы за яго ў 300 разоў. Адрозніваецца нізкай каларыйнасцю, устойлівы да ўздзеяння экстрэмальных тэмператур. Пры працяглым прыёме правакуе развіццё раку мачавога пузыра і вядзе да ўтварэння камянёў ў жоўцевым пузыры. У некаторых краінах афіцыйна прызнаны канцэрагенам.

— Эксперты дагэтуль не даюць адназначнага адказу, як падсалоджвальнікі ўплываюць на арганізм. Але ўсё больш звестак сведчыць пра тое, што яны здольны парушаць гарманальны баланс, аказваць негатыўны ўплыў на ўзровень цукру ў крыві, спрыяць страце кантролю над апетытам і нават парушаць кішачную мікрафлору. Таму мая парада: захацелася салодкага — звярніце ўвагу на праваныя і натуральныя прадукты — мёд і сухафрукты, — раіць Кацярына Сухавер.

Кніжны свет

«ЭРУДЫТ» АДЧЫНІЎСЯ НАНОЎ

Дзіцячая мастацкая і вучэбная літаратура, дапаможнікі для студэнтаў, беларуская класіка і папулярныя навінкі айчынных выдавецтваў, замежныя бестселеры — агулам звыш 1300 найменняў кніг, а таксама разнастайныя сувеніры і шырокая палітра канцылярскай прадукцыі — і ўсё гэта ў кампактнай, эрганамічнай і сучаснай «упакоўцы» на плошчы ў 42 квадратныя метры. Учора пасля капітальнага рамонту адкрылася для наведвальнікаў сталічная кнігарня «Эрудыт», якая набыла новы выгляд і змест акурат да свайго 20-годдзя.

belkniga.by

У першы рабочы дзень у новай краме адбылася прэзентацыя новай кнігі «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці» беларускай дзіцячай пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Таксама гучалі вершы на роднай мове ў выкананні пяцікласніцы мінскай гімназіі Міланы Тулупавай, ішла размова пра далейшае пашырэнне сеткі «Белкнігі».

Генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Аляксандр ВАШКЕВІЧ прызнаўся, што мадэрнізацыя доўжылася амаль паўгода і абышлася нятанна, затое цяпер кнігарня са сціплага закутка ператварылася ў месца прыцягнення для пакупнікоў — выкладчыкаў і студэнцкай моладзі, бацькоў і дзяцей, супрацоўнікаў шматлікіх арганізацый, якія працуюць побач і рэгулярна зазіраюць у «Эрудыт». З улікам пажаданняў наведвальнікаў складзены і асартымент, у якім выразны ўхіл зроблены на канцтавары (яны складаюць тры чвэрці ад усёй прапанаванай прадукцыі), а сярод прадстаўленых кніг значную долю займаюць сучасныя беларускія аўтары, якія маюць высокія рэйтынгі ў чытачоў, у тым ліку Наталля Батракова, Віктар Марціновіч і іншыя.

«На сёння ў сетку «Белкнігі» ўваходзіць 101 кніжная крама, 22 з іх у Мінску. За апошнія некалькі гадоў у 11 кнігарнях мы правялі мадэрнізацыю, — расказвае Аляксандр Вашкевіч, — гэта датычыцца і сучаснага абсталявання, і асартыменту, і вонкавага брэндавага афармлення. Ужо хутка, напярэдадні Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу пасля капітальнага рамонту адчыніцца яшчэ адна крама — вядомая «Кнігарня пісьменніка», і, спадзяюся, адзін ці два новыя кнігагандлёвыя аб'екты».

Адным з першых наведвальнікаў абноўленай кнігарні стаў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.**

— Аляксандр Мікалаевіч, 22 сучасныя кнігарні на сталіцу — ці не малавата? — спыталі мы міністра.

— Ёсць яшчэ даволі многа кіёскаў, але ў апошні год-паўтара мы іх зачыняем, бо гэта неэфектыўныя пункты, а стараемся ўкладвацца ў сур'ёзныя кнігарні. Адной з самых значных падзей сёлета стала мадэрнізацыя кнігарні «Светач», дзе адначасова знаходзіцца больш за 70 тысяч назваў кніг. Але важна не забывацца і пра такія крамы, як «Эрудыт», якая мае пэўную вядомасць і 20-гадовую гісторыю, і выдатна, што «Белкніга» зрабіла ўсё, каб кнігарня набыла новае аблічча. Спадзяюся, што тыя, хто непасрэдна будзе працаваць тут, па вуліцы Хмяльніцкага, выпрацуюць сваю гандлёвую і інфармацыйную палітыку, знойдуць пункты судакранання з пакупніком — а патэнцыйных пакупнікоў, асабліва моладзі, шмат — побач Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, не так далёка Акадэмія мастацтваў, універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, спадзяюся, будуць заглядваць і журналісты з Дома прэсы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

КАВАЛЕРЫ ЗАПРАШАЮЦЬ ДАМ, або Баль як культурны код

Нядзельнай раніцай у холе сталічнага Палаца культуры прафсаюзаў шматлюдна: больш за дваццаць пар юнакоў і дзяўчат малююць на падлозе нябачныя кругі і квадраты, сінхронна перацякаюць з аднаго танцавальнага па ў другое, паўтараючы рухі венскага вальса. «Там, там-тарам, там-тарам!» — гучна ставіць акцэнты харэограф, нагадваючы, у які бок рабіць паварот і як прыгожа трымаць кісці рук. Пры гэтым харэограф у спартыўным абутку, а практычна ўсе дзяўчаты — у туфлях на абцасах, каб адразу прызвычаіцца да правільных рухаў і каб запасу трываласці хапіла на цэлую танцавальную ноч. Так праходзіць чарговая рэпетыцыя дэбютантаў першага «Венскага балю з А1 у Купалаўскім тэатры».

АНГАЖЭМЕНТ

Дэбютанты ўдзельнічаюць у імпрэзе бясплатна — больш за тое, ім дапамагаюць і з танцавальнай падрыхтоўкай (цягам чатырох тыдняў праходзяць майстар-класы плюс абавязковыя штодзённыя «дамашнія заданні»), і з падборам бальных убораў (для дзяўчат гэта белыя сукенкі да падлогі, для хлопцаў — Black Tie, чорныя фракі альбо смокінгі).

...Удзельнікі пад кіраўніцтвам беларускага харэографа Аляксея Кісялёва і яго памочнікаў ужо некалькі тыдняў вучаць кадрылю, паланэз і венскі вальс. 40 чалавек, ці 20 пар, — асноўны склад, ёсць яшчэ каля дзесяці дублёраў — на той выпадак, калі нехта знянацку захварэе ці наўпрост не справіцца з нагрузкай. Сярод удзельнікаў, расказваюць куратары праекта, ёсць студэнты і аспіранты, былы вайсковец, аматар гістарычнай рэканструкцыі, ёсць нават праграміст адной з кампаній — арганізатараў балю — прычым на рабоце да апошняга не ведалі, што юнак падаў заяўку!

І ўсё ж унутраны чарвячок сумневу не дае спакою: ну дзе моладзь XXI стагоддзя, пакаленне digital, і дзе венскі баль стагоддзя XIX? Задаю пытанне ў лоб самім дэбютантам: «Навошта вам гэта трэба?»

«Трапіць на баль — гэта была мая мара! — ззяе ўсмешкай супрацоўніца аднаго з беларускіх банкаў і магістрантка Анастасія. — Аб'яву пра адбор знайшла нават не я, а мае бацькі — і, згадаўшы, як мы з татам танцавалі ў Аўстрыі каля тэатра вальс, я вельмі захацела паўдзельнічаць. А калі даведалася, што трапіла ў лік дэбютантаў з больш чым шасцісот чалавек — гэта і радасць, і гонар адначасова, і разуменне таго, што ў цябе адказная і пачэсная роля. Абавязкі дэбютантаў насамрэч нескладаныя і вельмі цікавыя, а памяць застанецца, мяркую, на ўсё жыццё».

Выпускнік Ваеннай акадэміі, пілот па прафесіі, Раман крыху губляецца і спачатку гаворыць пра сябе «мы», але хутка выпраўляецца: «Для чаго нам баль? Знайсці новых сяброў, пашырыць кола стасункаў — мы ж яшчэ маладыя людзі, паспеем дома насядзецца, а зараз час прыгод і новых захапленняў. Раней мне даводзілася ўдзельнічаць у оперным балі, і сябры падказалі паспрабаваць тут — вось, прайшоў. Што адчуваю? Сапраўднае захапленне! І насамрэч мы ўжо з многімі пасябравалі, так што зададзеную праграму выконваю».

ТАНЦУЮЦЬ УСЕ

— Дзяўчаты, кружымся лёгка — вы феі, вы сняжынкі! — распараджаецца педагог, і дзяўчаты зноў і зноў утвараюць на паркеце рознакаляровую завіруху, прагінаюцца, выконваючы разам з партнёрамі «балансэ», без якога немагчыма ўявіць венскі вальс. Дзве гадзіны рэпетыцыі пралятаюць як імгненне, і пакуль дэбютанты пераадзяваюцца для заняткаў па этыкеце, цікавімся ў харэографа: «Як вам вучні, здольныя?» — «Вельмі здольныя, з лёту разумеюць і паўтараюць рухі, якія я паказваю. З імі не трэба стаяць і гадзіну разбіраць асобныя фігуры: мы іх вывучылі літаральна на першым занятку, а цяпер толькі спалучаем у цэльную кампазіцыю, даводзім да аўтаматызму, каб танцавалася лёгка і нязмушана. І хоць музыка ў нас няпростая і «левабаковы» вальс нам, якія звыклі да правабаковага руху, таксама даецца складана, але спраўляемся», — хваліць сваіх падапечных Наталля.

Так-так, будучых дэбютантаў, якім выпала адкрыць новае для нашай краіны культурнае мерапрыемства, спецыяльны бальны камітэт адбіраў з больш чым 600 ахвотных — анкеты ад хлопцаў ва ўзросце 18—26 гадоў і дзяўчат, якім ад 16 да 23, прыйшлі з усіх рэгіёнаў Беларусі. На вочным сумоўі, куды дапусцілі аўтараў 200 самых грунтоўных і цікавых заявак, ацэньваліся не толькі танцавальныя навыкі, але і агульны кругагляд, актыўная жыццёвая пазіцыя, культурны ўзровень прэтэндэнтаў — напрыклад, іх прасілі вызначыць стыль тых ці іншых мастацкіх палотнаў.

РЭВЕРАНС НА РАЗВІТАННЕ

У праграме падрыхтоўкі і заняткі па культуры паводзін, прычым не толькі на балі (як запрашаць на танец або адмаўляць у ім, куды падзець клатч, хто адказны за памылкі ў танцы і чаму нельга танцаваць з адным кавалерам больш чым тры разы), але і ў побыце. Вось і цяпер заснавальніца Школы этыкету Аксана Зарэцкая звяртае ўвагу:

— Найчасцей, заходзячы ў пакой, дзе ўжо знаходзяцца іншыя людзі, многія робяць адну і тую ж памылку — адварочваюцца, калі зачыняюць дзверы. Але гэтага рабіць не трэба, інакш вы паказваеце непавагу да прысутных. Запомнілі? Добра, тады хадзем на лесвіцу, будзем вучыцца падаваць даме руку на прыступках.

Тут абсалютна ўсе заданні — практычныя: сказаць адно аднаму камплімент і з годнасцю падзякаваць, прадарэчы, практычна ніхто з гэтым заданнем не справіўся. Таму арганізатары ў мэтах лікбезу прывялі дэбютантаў у Нацыянальны мастацкі музей, а вядомы ў Мінску «музейны стэндапер», акцёр, радыёвядучы, навуковы супрацоўнік і экскурсавод Мікіта Моніч зрабіў гэты культпаход незабыўным.

вільна зрабіць і прыняць падарунак, рассадзіць гасцей у машыне з улікам сваяцкіх і сяброўскіх стасункаў, цывілізавана згладзіць наспяваючы канфлікт або выйсці з яго і г. д. Нават у агульнапрынятых дзеяннях ёсць столькі нюансаў, што сесці ў лужыну і адчуць сябе булгакаўскім Шарыкавым у кватэры прафесара Праабражэнскага лягчэй лёгкага. «Дзякуй вялікі! А давайце яшчэ правядзём заняткі па сталовым этыкеце!» — просяць вучні.

Месяц інтэнсіву — насамрэч вельмі мала, каб засвоіць тонкасці этыкету. Зрэшты, Аксана бачыць сваю галоўную задачу не ў гэтым: «Мне б хацелася не столькі чамусьці навучыць, колькі пасеяць зерне, прабіць тую лакуну, у якую з часам будзе сцякацца ўсё больш ведаў, нарастуць сталактыты і сталагміты разумення культурных з'яў, любові да мастацтва, да кніг, да тэатра і кіно, уменне атрымліваць з класічных твораў інфармацыю, якая дапамагае ў паўсядзённым жыцці, — пераадоленні стрэсу, рэакцыі на хамства ці, наадварот, праяве клопату і ўвагі. Гэта ўсё ўжо створана рукамі скульптараў і пэндзлямі мастакоў, апісана ў літаратуры, перададзена ў тэатральных пастаноўках, трэба толькі ўмець счытваць культурныя коды. Да гэтага трэба ісці, няхай сабе маленькімі крокамі. Бо каб ацаніць мастацкія глыбіні вялікіх твораў, патрэбны пэўны культурны бэкграўнд, нагледжанасць, начытанасць, якую трэба ў сабе выхоўваць, у тым ліку праз стасункі з цікавымі людзьмі. Венскі баль — адна з такіх цудоўных магчымасцяў, якую атрымалі нашы дэбютанты, і я спадзяюся, што яны скарыстаюцца ёй напоўніцу».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

• Калі вярстаўся нумар

Найсвяжэйшая навіна: баль пройдзе ў іншы час і ў новым фармаце! Арганізатары прынялі запрашэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь далучыцца да правядзення Венскага балю ў Палацы Незалежнасці 27 снежня. Пры гэтым, па задумцы рэжысёра, баль будзе ўлічваць традыцыі класічных венскіх баляў у Аўстрыі. Дэбютанты, якія раней прайшлі конкурсны адбор, атрымаюць магчымасць выступіць перад гасцямі мерапрыемства.

Кампанія А1 бярэ на сябе абавязак па аказанні дабрачыннай дапамогі грамадскаму аб'яднанню «SOS-дзіцячыя вёскі Беларусі» і пералічыць на адрас установы сродкі, эквівалентныя палове сумы, якую меркавалася выручыць ад продажу квіткоў на «Венскі баль у Купалаўскім», — дабрачынная місія праекта, такім чынам, будзе выкананая. Тыя ж, хто ўжо набыў білеты на «Венскі баль з А1 у Купалаўскім», змогуць вярнуць грошы ў касе Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў тэрмін з 4 да 20 снежня 2019 года.

«Пяць гадочкаў Пеця Вучыўся на бюджэце...»

Што было, — было. Адзін мужчынка ў ЗАГС прыйшоў — з пашпартам і пачкам грошай. «Хачу, — кажа, — нацыянальнасць змяніць». — «У вас тут, — чытае загадчыца, — напісана беларус. Вы хацелі б што іншае?» — «Не, хай застаецца тое ж... Толькі наперадзе адно слоўка дадайце: «Новы».

З гэтым складанасцяў у чалавека, відаць, не ўзнікла, таму ён іншай праблемай задаўся: наняў спецыяліста, каб аблічыў, колькі дроў на зіму спатрэбіцца. Той доўга, з выездам на месца, вывучаў праект, нешта мераў, лічыў колькасць пакояў, печак-камінаў, вокнаў... А ўрэшце выдаў: ад 30 да... 300 кубаметраў. «Колькі-колькі?! — не паверыў вушам той новы. — За што я грошы плаціў? Чаму такая лічба прыблізная?» — «Дык скуль ёй дакладнай быць, калі ніхто не ведае, якая будзе зіма?»

Адно зразумела (прычым кожнаму) — яна будзе! І, відаць, таму апошні конкурсны здымак (можна яшчэ раз глянуць на верхні) падштурхнуў да творчасці многіх чытачоў: ва ўсякім разе, подпісаў — хоць каўшамі бяры! І ў кожным — нешта ёсць! А зрэшты, чытайце самі:

Пасля здаўна святых Пакроў,
Калі зямля адпачывае,
Пашчыраваць ля пабудоў
Пара, нарэшце, наступае.
Міхась прачысціў дымаход
(Спачатку свой, затым —
суседчын),
Каб сустракаць зімы прыход
Не абы-як — па-чалавечы.

Згадзіцеся, пахвальная пазіцыя! Не дзіва, што ёй, вось такой, прысвяціла свае радкі не толькі **спадарыня Ніна Бурко з Бярэзіншчыны,** але і **спадар Мікола Кісель з Мінска:**

Камінар такі смяльчак —
Бач, забраўся на вільчак:
Ранкам панядзелка
Трубы чысціць дзеўкам.

А ў іншых — не вам казаць — пасля выхадных свае гараць...

Зрэшты, тут і вось зараз не столькі пра іх, — з «падачы» **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне:**

Рады Ганна з Мойшам,
Што сусед харошы,
Дымаход пачысціў
І падладзіў юшкі
Без капейкі грошай,
Нават без чакушкі!

Гэткія ж у людзей і сваякі бываюць. Прыклад патрэбен? Ды калі ласка:

Кліч ад цешчы быў як SOS...
На яго й ляцеў Хвядос,
«Сеўшы» мігам ля трубы,
Комін чысціў — не абы...
Зараз будзе печка грэць,
Не капціць і не дымець —
Небяспека знішчана,
Дымаход ачышчаны! —

радуецца за цешчу **спадарыня Іна Алісевіч з Уздзеншчыны,** а **Валянціна Гудачкова з Жыткавіч дык** найбольш за камінара, бо:

Гаварыла так кума:
«Будзе пляшачка віна
І з вяндлінкай бутэрброд,
Як прачысціш дымаход».
Ясь згадзіўся...
Добра жыць!
Можа, бізнес свой адкрыць?

Ну чаму б і не, калі першапачатковы капітал амаль не патрэбен, вытворчыя памяшканні — таксама. Нават рэкламная абвестка ўжо гатовая: **спадарыня Кусянкова** прыдумала — задарма аддае:

«Чышчу коміны ад сажы!
Дзе патрэбна, там падмажу...
І вазьму зусім няшмат!»
Коля ў вёсцы — нарасхват.

Па якой прычыне, можна было б не тлумачыць, але ж **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды** гэта зрабіў і нават перспектыву ўбачыў:

Многа ў вёсцы дымаходаў, —
«Верхалазаў?
Хіба Коля», —
Ад чаго (і з кожным годам)
За паслугу просіць болей:
То натуры, то валюты,
А як будзе спрытны,
За работу атрымае
Не адну паўлітру!

Што (на першы погляд), вядома ж, выгадна і таму (нават з таго ж канверта) —

...Хоць Мікола і з дыпломам,
Быць не хоча аграномам:
Прадаваў на рынку кветкі —
Развaліўся бізнес гэткі.
Каб не стацца дармаедам,
Плёў кашы з суседам-дзедам.
Дзед — памёр.
Няма больш пары.
Дык спрабуе камінарам...

Іншая рэч, ці так гэта проста?

Пачысціць комін яшчэ трэба ўмець, — заўважае **спадар Іван Сіманёнак з Пастаў,** — бо найболей сажы (нярэдка спрасаванай) «залягае» досыць нізка, амаль на ўзроўні юшкі. Але ж да яе і дабіраліся, і вычышчалі. І для гэтага ўсяго і трэ было, што ладны груз, кілаграмаў на пяць, моцная вяроўчына і елачка. А венік у коміне — гэта нейкая дурата, дзіцячая забава...

Адкуль:

Стась нагараваўся
З комінам над хатай,
Марна упіраўся
З венікам рагатым...
Дзецюку-мужчыну
Тут любы дарадзіць —
Слабенькім начыннем
Коміны не гладзяць!

З парадай наконт рыштунку выступае і **спадарыня Гудачкова.** «У мяне амаль такая ж труба, як на гэтым здымку», — заўважае яна. І дае цалкам прымальную параду:

Венік сажу не бярэ?
Нечым адкалупваць?
Трэба, хлопча, па трубе
Малатком пастукаць.

Альбо іншы спосаб пашукаць. А ўжо дзе? Падказкі ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

Смелы і вясёлы
На каньку прымак,
Ды нейкі ж неталковы —
Усё ў яго не так!..
Калі не цяміш, Вася,
Як і што рабіць,
У цешчы пацікаўся —
Скажа, так і быць!

А зрэшты, шукаць інфармацыю ў людзей старэйшых маладыя цяпер не любяць. У іх — іншыя аўтарытэты:

Паўдня шукаў Афоня
Парады у смартфоне!
Бубніў адтуль прафесар
Пра трубы і кампрэсар...
А ўрэшце баба Капа
Звязала венік з лапак,
І ўнук
такой мятлою
Расправіўся з бядою.

Бо трэба... І ўжо даўно, як лічыць **спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны:**

Хаты цепліць нам пара —
Адступіла восень.
Нават кот прыйшоў з двара
І пагрэцца просіць.

Можа, на сваю галаву?.. Баялі, адзін вайсковец (зараджаючым на флоце служыў) на пабыўку ў вёску прыехаў. Матуля з той радасці і чарку яму наліла, і ад пуза накармiла... Да грубкі хлапчына ледзьве адпоўз; па звычцы падпаліў, узяў на калені катка і газету (можа, нават нашу...), пагладзіў, нешта пачытаў ды і задрамаў, шчаслівы — не ўбачыў, як з печкі вугольчык пстрыкнуў...

Што далей было, чытаць трэба хутка. Маці ў крык: «Агонь!» Сын — на ногі, ката — у печ, дзверцы на «замок», сам у струнку: «Гармата к бою гатова!»

Каб вось гэтак мы — да зімы. А то ж, згадзіцеся, халады часам заспяваюць знянацку, дзякуючы чаму той кот зусім не пацярпеў, бо, паводле **спадара Мікалая Касмачэўскага з Наваполацка,**

Печку затапіў Пятрок —
Штось на хату прэ дымок:
Ну зусім ніякай цягі...
Гаспадар —
а нуль увагі,
Што ў трубе, навідавоку,
Пасяліліся сарокі.

З тога ж канверта — яшчэ адна актуальная прычына:

Каля печы — дым, гамонка.
Не уцяміць зранку жонка:
— Мусіць, нам у каляду
Хтосьці «вынайшаў» бяду,
Якой зроду не было:
Палажыў на комін шкло?!

...Але ж — згледзелі чытачы (за што рэспект і ўважуха, як кажа моладзь) і бязліч іншых тэм, часам — зусім нечаканых.

«Давайце яшчэ раз прачытаем «Мойдодыра», — прапануе **спадар Мікалай Старых з Гомеля,** — і звернем увагу на радкі:

«А нечистым
Трубочистам —
Стыд и срам!»

На думку спадара Міколы, не варта абражаць людзей, якія робяць хай брудную, але ж патрэбную справу.

Ад яго ж і слушная «папраўка»:

Майдадыр ты наш
шаноўны —
Чысціні баец галоўны,
Каб не праца камінара,
Люд цярпеў бы
ад пажараў...
Хто працоўных зневажае,
Мусіць, сораму не мае?!

Хоць часам — на жаль і на думку **спадарыні Чыгрынавай** — тыя самыя працоўныя іншага і не заслугоўваюць:

Развал у гэтай хаце
Зрабіўся не за раз,
Рабочых з біржы працы
Прымалі у калгас.
Жылі тут пустадомкі,
І запар...
тры сям'і,
Што хлеб шукалі лёгкі
І доўгія рублі.

З таго ж канверта і дасціпнае:

Не бурай дах парвала,
Трубу не гнуў віхор,
Шабашка працавала, —
Ёй ганьба і дакор...
Але ж аб'ект прынялі,
Хоць зроблена так-сяк,
Бо ўмела налівалі
Гарэлку і каньяк.

Як доўга вілася гэтая вяровачка, невядома, але ж канец ёй (паводле **спадара Сабалеўскага**) настаў:

Янку новая мятла
Ў камінары замяла:
Кіраваў, нібы, лясгасам,
СВК і камунгасам —
Горла драў аж да знявагі,
На рабочых — нуль увагі...
А пазбавіўся пасад —
І такой вось працы рад.

А зрэшты, ёю, як лічыць моладзь у асобе **васьмікласніцы СШ № 3 г. Вілейка Карыны Цанунінай,** тут якраз і не пахне:

Павер, чытач мой дарагі,
Не будзе іншай тут работы,
Бо гэты ўнук Бабы Ягі
Ізноў рыхтуецца да ўзлёту.

І для гэтага

Адабраў у Бабы Ёжкі
Сродак транспартны ўнук,
Па-над вёскаю пагойсаў,
Нібы ластаўка ці жук.
Ды за комін зачапіўся,
І куды падзеўся понт:
Трэба тэпаць з гэткай выcі
Да Кашчэя ў капрамонт.

Гэта — зноў жа — **спадар Сабалеўскі,** а следам за ім і **спадарыня Наталля Шкут са Светлагоршчыны:**

Ёсць мятла...
Сюды б і ступу,
Лахманы і «макіяж».
Не глядзелі б зараз тупа:
Скуль жа гэты персанаж?

Досыць нечаканы адказ на такое пытанне ў **спадарыні Чыгрынавай:**

Пяць гадочкаў Пеця
Вучыўся на бюджэце.
Далей — размеркаванне,
Як тэст на выжыванне,
У слабенечкі калгас...
І жытло — на першы час.

Іншы, згадзіцеся, спалохаўся б — вось такога дома, жытла (можна яшчэ раз зірнуць на здымак), а гэты — здымаем капялюш — не: чым можа, чысціць свой комін, збіраецца жыць і працаваць.

Аптыміст: на такіх, кажуць, шмат што атрымаецца, бо галоўнае для іх — не здавацца, выйсце шукаць з любой, нават, здавалася б, самай безнадзейнай сітуацыі, якую ўбачыла на здымку тая ж **спадарыня Кусянкова:**

Не звяртала Вера
Ўвагі на Валеру,
Тады гэты вастраслоў
З боку «цешчы» падышоў:
Комін ёй падладзіў —
Без віна, без грошай...
І прызнала Ўладзя:
Будзе зяць харошы.

Засталося дачку пераканаць...

Тую ж любоўную лінію адшукалі на здымку і **сужэнцы Астроўскія з Мінска**

Ходзяць чуткі, што у Яся
Ёсць суседачка Настасся
І ён ходзіць не абы...
Ўжо дабраўся да трубы.
А што будзе — паглядзім —
Паміж ёй і паміж ім.

...А зрэшты, вернемся (з падачы **спадарыні Гудачковай**) да таго, з чаго пачалі вось гэты агляд:

Кажуць вучаныя людзі,
Што зімы болей не будзе...
Толькі веры ў гэта мала —
Трубы чысцім дасканала.
Дроўцы сушым у запас —
МНС пахваліць нас.

Мо нават прэмію выдасць, бо не ўсё ж прадпісанні пакідаць ды штрафы налічваць за тое, што (паводле **сужэнцаў Астроўскіх**)

Мы жывём, як павялося,
Больш з надзеяй на Авося.
Хоць Авось той —
не вяльможа
І нашкодзіць гэтак можа...
Так што грэбуй ці не грэбуй,
А трубу пачысціць трэба!

Вось на гэтай аптымістычнай ноце і завяршылі б чарговы агляд, калі б не вынікі.

Такім чынам, паводле вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра самотную бландзінку-маляра (гл. нумар «Звязды» ад 2 кастрычніка) напісалі **спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска і Валянціна Гудачкова з Жыткавіч, спадары — тры Міколы — Касмачэўскі з Наваполацка, Кісель з Мінска і Старых з Гомеля,** а таксама **Валерый Гаўрыш з Чавус...** З чым, павагаўшыся, згадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал 2020 года накіроўваецца ў слаўны горад Чавусы.

Хочаце, каб газета пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо афармiць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на чарговы здымак, прыдумаць да яго подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных і кароткіх — не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на перамогу мае кожны! Як той казаў, некалі мы сустрэнем шчасце, а пакуль будзем сустракаць Каляды і Новы 2020...

Спадзяёмся, разам?

Валянціна ДОЎНАР.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Официальные правила проведения Рекламной игры

«Покупки в выгодном свете»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Покупки в выгодном свете» (далее – Правила), направленной на стимулирования проведения безналичных платежей держателями платежных карт Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Карта), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Покупки в выгодном свете» (далее – Рекламная игра).

1. Организатор

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518. Адрес Организатора: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, оф. пом. 1 (далее – Организатор).

2. Заинтересованное лицо

Заинтересованным лицом Рекламной игры является:

ООО «Триовист», общество с ограниченной ответственностью, свидетельство о регистрации № 190806803 выдано 22.02.2007 года Минским городским исполнительным комитетом. УНП №190806803.

Адрес: 220020, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, 100, оф. 203, 2-й этаж (далее – Заинтересованное лицо).

3. Участники Рекламной игры

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет и являющиеся держателями платежных карт Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Карта).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

4. Название Рекламной игры: «Покупки в выгодном свете»

5. Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

6. Дата начала Рекламной игры: 1 декабря 2019 г.

7. Дата окончания Рекламной игры: 10 марта 2020 г.

8. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра: Рекламная игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей держателями платежных карт Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – безналичная операция).

9. Призовой фонд Рекламной игры

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет имущества Заинтересованного лица и имущества и денежных средств Организатора в размере 238 894,45 (двести тридцать восемь тысяч восемьсот девяносто четыре) белорусских рубля 45 копеек.

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

№	Полное наименование состава призового фонда	Короткое наименование призового фонда	Кол-во	Оценка приза в баллах	Стоимость за ед., бел. руб.	ИТОГО стоимость, бел. руб.
1	Подарочный сертификат 21 vek + на 10 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 10 рублей	1653	30	9,434	15 594,40
2	Подарочный сертификат 21 vek + на 20 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 20 рублей	400	40	18,87	7548,00
3	Подарочный сертификат 21 vek + на 40 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 40 рублей	200	60	37,740	7548,00
4	Подарочный сертификат 21 vek + на 5 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 5 рублей	500	20	4,7175	2358,75
5	Подарочный сертификат 21 vek + на 60 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 60 рублей	100	70	56,61	5661,00
6	Подарочный сертификат 21 vek + на 75 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 75 рублей	50	75	70,797	3539,85
7	Подарочный сертификат 21 vek + на 10 рублей. Срок действия: до 01.12.2020	Сертификат на 10 рублей	2	30	10,00	20,00
8	Гардины Ikea «Майгулл» 804.178.01	Гардины Ikea	10	80	91,98	919,80
9	Отпариватель Polaris PGS 1518CA SteamProfi (мятный/белый)	Отпариватель Polaris	60	80	99,00	5940,00
10	Ультразвуковой увлажнитель воздуха Polaris PUH 5545	Увлажнитель воздуха Polaris	50	75	75,48	3774,00
11	Телевизор Samsung UE43RU7410U	Телевизор Samsung	12	350	1 398,96	16 787,52
	Денежное вознаграждение				189,47	2273,64
12	Холодильник с морозильником Liebherr CNkw 4313	Холодильник Liebherr	5	350	1365,00	6825,00
	Денежное вознаграждение				184,39	921,95
13	Универсальный набор инструментов Partner 41082-5 / PA-40108	Набор инструментов Partner	60	120	102,36	6141,60
14	Дрель Bosch EasyImpact 550 (0.603.130.020)	Дрель Bosch		120	117,96	7077,60
15	Блендер погружной Zigmund & Shtain BH-228 M	Блендер погружной Zigmund & Shtain	50	90	90,42	4521,00
16	Электрочайник Zigmund & Shtain KE-822	Электрочайник Zigmund & Shtain	100	100	78,42	7842,00
17	Кресло офисное «Седия» Ares (зеленый/черный)	Кресло офисное Ares	10	120	139,86	1398,60
	Денежное вознаграждение				1,32	13,20
18	Кресло офисное «Седия» Ricci (зеленый/черный)	Кресло офисное Ricci	40	120	137,46	5498,40
	Денежное вознаграждение				0,97	38,80
18	Портативная колонка JBL Charge 4 (зеленый)	Портативная колонка JBL	100	150	358,98	35 898,00
	Денежное вознаграждение				34,07	3407,00
20	Диван Ikea «Ландскруна» 893.198.77	Диван Ikea	4	550	2325,06	9 300,24
	Денежное вознаграждение				327,85	1311,40
21	Ноутбук Asus VivoBook X512UB-EJ097	Ноутбук Asus VivoBook и сумка для ноутбука	10	400	1509,00	15 090,00
	Денежное вознаграждение				205,91	2059,10
	Сумка для ноутбука Versado 716/15 (зеленый)				36,78	367,80
22	Пылесос Philips FC8297/01	Пылесос Philips	100	180	190,26	19 026,00
	Денежное вознаграждение				8,85	885,00
23	Смартфон Xiaomi Redmi Note 8 Pro 6Gb/64Gb Forest Green	Смартфон Xiaomi Redmi Note 8	25	250	658,98	16 474,50
	Денежное вознаграждение				78,89	1972,25
24	Ковер Ikea «Лангстед» 904.080.47	Ковер Ikea	20	80	145,86	2917,20
	Денежное вознаграждение				2,22	44,40
25	«АЛЭНГ» Светильник напольный икелированный/белый – Артикул: 703.822.89	Светильник напольный	30	85	136,08	4082,40
	Денежное вознаграждение				0,76	22,80
26	«БЕСТО» Шкаф для ТВ, комбин./стеклян. дверцы под беленый дуб Сельсвикен/глянцевый/серо-зеленый светлый, прозрачное стекло 240 x 40 x 128 см I Артикул: 692.506.28	Шкаф для ТВ, 240 x 40 x 128 см	3	150	851,90	2555,70
	Денежное вознаграждение				107,72	323,16
27	«КАЛЛАКС» Стеллаж белый 147 x 147 см – Артикул: 703.795.69	Стеллаж белый, 147 x 147 см	10	120	339,72	3397,20
	Денежное вознаграждение				31,19	311,90
28	«КНОКСХУЛЬТ» Кухня серый 220 x 61 x 220 см – Артикул: 491.841.73	Кухня, 220 x 61 x 220 см	1	350	1288,35	1288,35
	Денежное вознаграждение				172,94	172,94
29	«ЛАНДСКРУНА» Кресло, Гуннаред светло-зеленый/металл – 592.697.27	Кресло	5	150	1016,36	5081,80
	Денежное вознаграждение				132,44	662,20
ИТОГО			3 610			238 894,45

10. Порядок участия в Рекламной игре:

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 01.12.2019 по 31.01.2020:

10.1. *Зарегистрироваться*, а именно ввести в соответствующие поля на сайте belarusbank.21vek.by (далее – сайт)

- номер телефона Участника в международном формате;
- фамилию, имя и отчество Участника на русском языке (согласно документу, удостоверяющему личность).

10.1.1 После прохождении регистрации участник получает посредством SMS-сообщения код для входа в личный кабинет на сайте. Уведомление об успешном прохождении или о непрохождении регистрации Участник получает в личном кабинете на сайте не позднее 5 рабочих дней после регистрации.

SMS-сообщение с кодом для входа в личный кабинет участнику необходимо сохранить до окончания Рекламной игры.

После получения Участником уведомления об успешном прохождении регистрации на сайте Участнику доступен личный кабинет на сайте, где отображаются накопленные баллы и призы Призового фонда рекламной игры, доступные для участия в розыгрышах.

10.1.2. В случае если причиной в отказе регистрации окажется отсутствие держателя карты с указанным номером телефона и/или именем и фамилией в базе банка, Участнику необходимо обратиться в учреждение, где была оформлена банковская карта, для обновления данных и последующей возможности регистрации. Срок обновления данных банком – до 2 рабочих дней.

10.1.3. В случае попытки регистрации Участником одного и того же номера телефона дважды или более раз повторные данные не будут приниматься к участию в Рекламной игре.

10.2. *Осуществить безналичную операцию* оплаты товаров, работ (услуг) в организациях торговли (сервиса) с использованием Карты в период с 01.12.2019 по 31.01.2020. К участию в Рекламной игре принимаются безналичные операции не менее 5,00 (пяти) бел. руб.

Не является основанием для участия в Рекламной игре осуществление следующих операций:

- безналичных операций, совершенных до 00.00 01.12.2019 г. или позже 23.59 31.01.2020 г. по Минскому времени;
- операций по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;
- операций, совершенных посредством банкоматов и инфокиосков, М-банкинга, интернет-банкинга, в кассах отделений банка, учреждениях РУП «Белпочта» и в системе «ЕРИП»;
- операций по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку.

10.3. Накопить необходимое количество баллов для возможности участия в розыгрыше конкретного приза (согласно п. 9 Правил). Баллы Участника конвертируются из суммы безналичных операций, совершенных в период с 01.12.2019 (00.00) до 31.01.2020 г. (23.59).

10.3.1. Статус накопления баллов доступен к отслеживанию в личном кабинете на сайте. При осуществлении возврата товаров, работ (услуг) начисление баллов на эту сумму не производится.

10.3.2. Баллы Участникам за совершенные безналичные операции будут начислены не позднее 2 суток после совершения операции (на операции, совершенные в рабочие дни) и не позднее 5 суток (на операции, совершенные в выходные дни (сб., вс.) и официальные выходные дни и праздничные дни).

При осуществлении возврата товаров, работ (услуг) начисление баллов на эту сумму не производится.

10.3.3. Механика конвертирования суммы безналичной операции в баллы: к участию в Рекламной игре принимаются безналичные операции не менее 5,00 бел. руб. При этом максимальная сумма безналичных транзакций, которая может быть конвертирована в баллы, не может превышать 5 500,00 бел. руб в сутки. Участник игры получает 1 балл за безналичную операцию суммой от 5,00 бел. руб до 14,99 бел. руб. Последующее округление суммы безналичной операции в баллы производится до целых чисел по математическим законам (от 0 до 4 в меньшую сторону, от 5 до 9 – в большую).

Например, если сумма безналичной операции 6,6 руб. = 1 балл; 12 руб. = 1 балл; 15,1 руб. = 2 балла и т. д.

10.4. *Первым выбрать любой Приз* в личном кабинете на сайте из перечня призов (п. 9 Правил) при условии накопления необходимого для участия в розыгрыше приза количества баллов (далее – определить приз). Ввести на сайте в личном кабинете адрес электронной почты для возможности уведомления Победителя и подтвердить адрес электронной почты, перейдя по ссылке из сообщения, отправленного на нее.

Призы к выбору в личном кабинете доступны до 23.59 04.02.2020 года.

10.4.1. Призы к выбору в личном кабинете не доступны ежедневно с 24 часов 00 минут до 7 часов 00 минут, а также от 0 до 5 минут каждого часа во время проведения розыгрышей (в соответствии с п. 14) для актуализации количества призов, доступных для участия в розыгрыше.

10.4.2. Призы к выбору в личном кабинете доступны до 23 часов 59 мин 04.02.2020 за исключением периода, указанного в п. 10.4.1 Правил.

11. Уведомление об успешном определении приза Участник получает в диалоговом окне на странице сайта с присвоением Порядкового номера Участника (1000000, 1000001, 1000002 и т. д., присвоенный согласно времени и дате оставления участником заявки на получение приза (определения приза).

12. В Рекламной игре можно принимать участие неограниченное количество раз при выполнении условий Рекламной игры, предусмотренных настоящими Правилами.

13. Организатор не несет ответственности за достоверность сведений, указанных Участниками при регистрации на Сайте.

14. Место, даты, время и порядок проведения Розыгрышей призового фонда, порядок определения победителей Рекламной игры

Розыгрыши Призов проводятся с 04.12.2019 по 04.02.2020 каждый час с 8 часов 00 минут до 24 часов 00 минут (далее – розыгрыш) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ленина, дом 50, 5-й этаж, офис 1.

14.1. Члены комиссии определяют Победителей розыгрыша каждого приза путем определения из сформированного при проведении розыгрыша списка первых (по времени и дате выбора приза) выполнивших условия п.10 Правил, а именно:

• В розыгрыше в 8 часов 00 минут 04.12.2019 участвуют Участники, которые первыми (по времени и дате выбора приза) выполнили Условия п. 10 Правил с начала Рекламной игры (7 часов 00 минут 01.12.2019) до 7 часов 59 мин 04.12.2019 г.

• В каждом следующем розыгрыше принимают участие Участники, которые первыми (по времени и дате выбора приза) выполнили Условия п. 10 Правил с начала Рекламной игры (7 часов 00 минут 01.12.2019) до 59 мин часа, предшествующего розыгрышу, за исключением Участников, признанных победителями в предыдущих розыгрышах.

Участник, который первым (согласно времени и дате выбора приза) выполнил условия участия в Рекламной игре (п. 10 Правил), признается Победителем (за исключением Участников, признанных Победителями в предыдущих розыгрышах Рекламной игры).

14.2. Розыгрыш Призов проводится по порядку и в количестве, описанном в п. 9 настоящих Правил. Не разыгранные призы розыгрыша переходят в следующий розыгрыш до момента, пока все количество каждого вида Призов не будет разыграно.

14.3. По результатам каждого розыгрыша на сайте будет доступна актуальная информация о количестве призов, в розыгрыше которых Участники могут принять участие в следующих розыгрышах.

14.4. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

14.5. В случае если Победители конкретного приза в обозначенном в п. 9 Правил количестве будут определены ранее, чем до 24 часов 00 минут 04.02.2020, то дальнейшие розыгрыши этого приза не проводятся.

14.6. В случае если призовой фонд Рекламной игры к моменту ее окончания будет разыгран не полностью, то не разыгранные призы остаются в распоряжении Организатора.

15. В течение 22 календарных дней с даты признания Участника Победителем Рекламной игры Организатором будет проведена проверка безналичных операций Победителя на предмет отсутствия возвратов товаров, работ (услуг) в организации торговли (сервиса).

15.1. В случае выявления Организатором возвратов товаров, работ (услуг) в течение 22-дневного периода с момента признания Участника Победителем, в выдаче приза Рекламной игры Победителю будет отказано, приз остается в распоряжении Организатора.

В случае выявления возвратов товаров, работ (услуг) и непрохождения проверки Победитель получает об этом уведомление sms-сообщением, отправленным на номер телефона, указанный при регистрации, и уведомлением в личном кабинете на сайте.

15.2. В случае успешного прохождения проверки и не выявления возвратов участник получает об этом уведомление в личном кабинете на сайте, сообщение, отправленное по адресу электронной почты, указанной в личном кабинете на сайте, и sms-сообщение. Приз будет передан победителю в соответствии с п. 16.2 правил.

16. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша

16.1. В случае успешного прохождения проверки Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше посредством отправки сообщения на адрес электронной почты, указанной в личном кабинете на сайте, уведомлением в личном кабинете на сайте Рекламной игры не позднее 27 дней со дня проведения розыгрыша.

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей звонком по телефону, указанному при регистрации на сайте, и sms-сообщением.

16.2. Организатор за счет собственных средств до 10 марта 2020 г. обеспечивает доставку призов (за исключением сертификатов всех номиналов) Победителям посредством курьерской службы 21vek.by по адресам фактического проживания или нахождения Победителей. Форма заполнения (для указания адреса доставки) для доставки приза будет доступна участнику в личном кабинете на сайте после определения приза участником.

Призы Сертификаты всех номиналов Победителям будут переданы (вручены) до 10 марта 2020 г. на адрес электронной почты и размещены в личном кабинете на сайте и считаются переданными с момента отправки их на адрес электронной почты победителя и с момента его размещения в личном кабинете на сайте Рекламной игры. Форма заполнения (для ввода электронной почты) будет доступна участнику в личном кабинете на сайте после определения приза участником.

16.3. Призы (за исключением сертификатов всех номиналов) выдаются Победителям при наличии документа, удостоверяющего личность, и после оформления документов, связанных с выдачей приза.

16.4. Приз (за исключением сертификатов всех номиналов) считается переданным Победителю с момента подписания Победителем акта-приема передачи приза и других необходимых для их получения документов, предоставляемых Организатором через службу доставки 21vek.by, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

16.5. В случае если Победитель не может получить Приз лично, Приз может получить его доверенное лицо по предъявлении документа, удостоверяющего личность, и нотариально заверенной доверенности.

16.6. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством Призов.

16.7. В случае если Призы не выданы в установленные Правилами Рекламной игры сроки согласно п. 16.2 и/или с Победителями не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, либо достоверность данных об совершенных операциях не подтверждается, или Организатором выявлен факт возврата Победителем товаров, работ (услуг) в предприятия торговли (сервиса) в течение 22 календарных дней после признания Участника Победителем, то Призы остаются в распоряжении Организатора.

16.8. При получении следующих призов: телевизор Samsung, холодильник Liebherr, кресло офисное Ares, кресло офисное Ricci, портативная колонка JBL, диван Ikea, ноутбук Asus VivoBook и сумка для ноутбука, пылесос Philips, смартфон Xiaomi Redmi Note 8, Ковер Ikea, светильник напольный, шкаф для ТВ, 240 x 40 x 128 см, стеллаж белый, 147 x 147 см, кухня, 220 x 61 x 220 см, кресло, победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) при выдаче приза из денежной части приза (денежного вознаграждения). Денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере.

17. Комиссия по проведению Рекламной игры

Для контроля соблюдения официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель комиссии – Лейкина Карина Александровна, ООО «Пиар квадрат», управляющий.

Члены комиссии:

Кожемяко Ирина Михайловна, ООО «Пиар Куб», менеджер по реализации проектов;

Нахайчук Светлана Геннадьевна, ООО «Пиар квадрат», менеджер по реализации проектов;

Гончаренко Дарина Вячеславовна, ООО «Пиар Куб», ассистент менеджера по персоналу;

Шилинская Кристина Сергеевна, ООО «Пиар Куб», юрисконсульт.

18. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры

18.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

18.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 4 марта 2019 г. включительно.

18.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Рекламной игры, а также по телефону: +375 (29) 632-61-00 (с 1.12.2019 по 10.03.2020 года. Время работы: ежедневно с 12.00 до 19.00 (стоимость звонка тарифицируется в соответствии с тарифами мобильного оператора, услугами которого пользуется Участник).

19. Прочие условия

19.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования, а также согласие на получение sms-сообщений и электронных уведомлений, предусмотренных настоящими Правилами.

19.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Розыгрышей дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

19.3. Организатор не несет ответственности за работу сети интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети интернет Участнику), операторов сотовой передвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.).

19.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Победителями в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

19.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: РБ, 220030, г. Минск, а/я 171.

Свидетельство № 3701 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 29 ноября 2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ТАКІЯ ГАРАЧЫЯ БАІ

Ён вызваляў гарады-героі Новарасійск, Керч, Севастопаль і з баямі прайшоў паў-Еўропы

Старшыню Рэчыцкага раённага Савета ветэранаў Вячаслава Папова я заспеў у яго кабінеце якраз тады, калі ён рыхтаваўся пачаць абход удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, павіншаваць іх з 75-годдзем вызвалення Беларусі, даведацца, у якой канкрэтнай дапамозе яны маюць патрэбу. Першы візіт ён запланаваў да Сяргея Рыгоравіча Нябеснага. Я напрасіўся пайсці да ветэрана разам з ім.

Ветэран у россыпе баявых узнагарод.

Нябесныя жывуць у райцэнтры на вуліцы Леніна, і гаспадыня Настасся Фёдараўна адразу паведаміла, што іх саюзу ўжо 72 гады. Пажаніліся пасля таго, як Сяргей Рыгоравіч дэмабілізаваўся з арміі. І пахвалілася яшчэ, які ў маладосці быў ён спрытны ва ўсіх справах. Вось спытайце яго (кажа нам), колькі Сяргей Нябесны захопнікаў-фрыцаў на той свет адправіў. І за што сам Сталін восем падзяк яму аб'явіў.

Сяргей Рыгоравіч спрабаваў сказаць жонцы, што не з таго з гасцямі гаворка пачалася, але тут на стале апынуўся ўзнагародны ліст з апісаннем яго подзвігу ў сакавіку 1945 года пры вызваленні Чэхіі. «У баях за населены пункт Аламоўц тав. Нябесны быў прызначаны старшым разведгрупы. Пад агнём ворага кулямёта фарсіраваў раку Марава, у распачатым баі быў паранены, але працягваў змагацца з праціўнікам. У гэты час праязджала аўтамашына з нямецкімі салдатамі. Тав. Нябесны кінуў у машыну тры гранаты і забіў 5 нямецкіх афіцэраў і каля 20 нямецкіх салдат. За час баявых дзеянняў Нябесны ўзяў у палон 7 нямецкіх салдат і 2 афіцэраў. За што быў прадстаўлены да ордэна Славы III ступені».

— Узнагародны ліст падпісаў камандзір 1337-га горна-стралковага ордэна Суворава трэцяй ступені палка 318-й горна-стралковай дывізіі Павел Паўлавіч Карабельшчыкаў. Выдатны гэта быў чалавек, строгі, чулы і справядлівы, вельмі любіў салдат. Апошні раз я сустрэўся з ім і яшчэ некалькімі сваімі баявымі таварышамі — Валодзем Шваенкам, Андрэем Дзегцярэнкам і іншымі — у 1983 годзе ў Наварасійску на 40-годдзі вызвалення горада, — кажа Сяргей Рыгоравіч і паказвае альбом «Героі Вогненнай зямлі — удзельнікі дэсанту на Эльціген».

— А наогул, як вы апынуліся на фронце, Сяргей Рыгоравіч? — перапыніў я аповед ветэрана. — Якія яшчэ ўзнагароды маеце?

Тут слова зноў узяла Настасся Фёдараўна:

— Вам цікава будзе даведацца, што бацька Сяргея Рыгоравіча, гарачы данскі казак Рыгор Ананьевіч Нябесны, быў храбрым байцом Першай коннай арміі Будзённага, а ў Рэчыцы закахаўся ў мясцовую жыхарку Кацярыну Ігнатаўну Казлову. У яе ад першага шлюбу былі сыны Барыс і Рыгор, якія, дарэчы, закончылі Вялікую Айчынную вайну ў званнях падпалкоўніка і маёра, і дачка Ніна (светлая памяць ім). А Сяргей нарадзіўся ў 1924 годзе і Рыгора Ананьевіча не памятае, бо той пакінуў сям'ю і вярнуўся на Дон. Цесных роднасных сувязяў паміж Нябеснымі і Казловымі не было. А што воінская доблесць майго мужа ад яго бацькі — дык гэта факт.

— Дык ты ўжо заадно і пра сябе раскажы, — усміхнуўся Сяргей Рыгоравіч.

— А што, раскажу. У вайну, калі яна пачалася, мне было 14 гадоў, і наша сялянская сям'я жыла ў вёсцы Смычок Буда-Кашалёўскага раёна. Насёрбаліся гора пры немцах па самую завязку. Добра, што ў Германію ў рабства не загналі. Дзякуй старасту Зянькевічу, які заўсёды папярэджваў людзей пра аблавы. Выратоўваліся ў прыдняпроўскіх лазняках і балацянках. Брат мой Дзмітрый быў танкіст, прапаў без вестак, а Васіль — радыст быў, вярнуўся з вайны з ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу». Па-

Сяргей Нябесны ў жніўні 1945 года.

мёр небарака. Ды і я не якая там «кыш-варона». 22 гады адпрацавала поварам пры вайсковай часці і ўзнагароджана медалём «За доблесную працу». Чым не пара Сяргею Рыгоравічу?

...Пасля восьмага класа Сяргей паступіў у школу фабрычна-заводскага навучання і, атрымаўшы спецыяльнасць электраманцёра, з аднагрупнікамі апынуўся ў горадзе Грозным, дзе браў удзел у пераабсталяванні нафтаперагонных заводаў. А тут — вайна, і ён, 17-гадовы, з такімі ж, як сам, выраšыў пайсці дабравольцам на фронт. У ваенкамаце сказалі: чакайце свайго часу. І ён прыйшоў: у сакавіку 1942-га Сяргей стаў курсантам 3-га Бакінскага пяхотнага вучылішча. Праз шэсць месяцаў яго расфарміравалі, бо ўзнікла пагроза захопу горада, і яго курсанты ўліліся ў склад Маскоўскай 103-й курсанцкай брыгады, што фарміравалася ў гарах Азербайджана. Яна была адпраўлена пад Новарасійск, які быў ужо ў руках фашыстаў. Немцы ўладарылі на раўнінах, а чырвонаармейцы атабарыліся ў гарах, адкуль начамі рабілі напады на іх.

Баявыя дзеянні для Сяргея Нябеснага пачаліся пад Геленджыком у складзе батальёна аўтаматчыкаў. У адной сутычцы з ворагам ён быў кантужаны і некалькі месяцаў праляжаў у ваенным шпіталі горада Сочы. Потым вяртанне на фронт, але ўжо ў складзе 318-й горна-стралковай Новарасійскай стралковай дывізіі, дзе быў прызначаны тэлефаністам пры яе штабе. А гэта значыць, што і ў час баёў, і ў перапынках паміж імі яму трэба было забяспечваць сувязь штаба з батальёнамі, палкамі і іншымі вайсковымі фарміраваннямі, якія знаходзіліся на перадавой. Нярэдка тэлефонны кабель пашкоджваўся пасля разрываў мінамётных ці артылерыйскіх снарадаў, і яго трэба было аднаўляць — дзе паўзком, дзе подбегам з катушкай на спіне. У час аднаго такога бою яго плечы секанула асколкам. На шчасце, раненне аказалася лёгкае, і праз 20 дзён знаходжання ў дывізійным медсанбаце Сяргей Нябесны вярнуўся ў строй. І трапіў, як кажуць, з агню ды ў полымя: у палкавую разведку. У час карэкціроўкі агню, пры начных аперацыях па здабычы «языка» небяспека заўсёды была вялікая. Нават ад сваёй палкавой артылерыі, якая, згодна з распрацаваным планам, у час разведкі боем біла па ворагу ўсімі наяўнымі гарматамі ў адно і тое ж месца, што давала разведчыкам магчымасць падпаўзаць пад самыя яе разрывы, а затым, калі яна пераносіла агонь наперад, штурмаваць акопы ці бліндажы. Крый божа крыху памыліцца ці прамарудзіць.

— У якія толькі сітуацыі не даводзілася трапляць на вайне, — уздыхае ветэран. — Не хацелася б успамінаць аб іх, але куды падзенешся. Хіба магчыма забыць, як у сакавіку 1945 года ў час захопу «языка» я, можна сказаць, быў за крок ад смерці, бо ў мяне гатовы былі стрэліць восем фрыцаў, ды я апярэдзіў іх? Усе яны там і леглі ад майго аўтамата. За гэта атрымаў свой другі медаль «За адвагу».

Заўважыўшы маю цікаўнасць да альбома «Героі Вогненнай зямлі — удзельнікі дэсанту на Эльціген», у якім таксама былі змешчаны фатаграфіі Нябеснага і яго баявых таварышаў, Сяргей Рыгоравіч патлумачыў, што такога населенага пункта цяпер няма. Пасёлку далі другую назву — Героеўскае — у памяць аб гераічных дзеяннях дэсантнікаў, якія фарсіравалі Керчанскі праліў у яго самай шырокай воднай прасторы, у жорсткіх баях захапілі плацдарм на Крымскім узбярэжжы і ўтрымлівалі яго. То было самае сапраўднае пекла, пра якое ветэрану не хочацца ўспамінаць.

Пасля вызвалення Керчы наперадзе былі Севастопаль, Балаклава. Баі ішлі такія, што гарэла зямля, паўсюдна тысячы і тысячы загінулых. Крымскі паўвостраў быў ачышчаны ад ворага, які адступіў на захад. У складзе 4-га Украінскага фронта Сяргей Рыгоравіч гнаў яго ў сваю бярлогу, адначасна вызваляючы польскія і чэшскія гарады і пасёлкі — Кошыца, Гуменне, Новы-Тарг, Аламоўц, Мараўская Острава.

Дайсці да Берліна яму не ўдалося, бо 16 красавіка 1945 года ў яго трапіла некалькі асколкаў гранаты, і дзень Перамогі ён сустрэў у шпіталі. Ратныя подзвігі ветэрана-інваліда адзначаны ордэнамі Славы трэцяй ступені і Айчыннай вайны першай ступені, двума медалямі «За адвагу», медалямі «За абарону Каўказа», «За перамогу над Германіяй».

Пасля вайны старшы лейтэнант запасу аднаўляў свой родны горад, працуючы электраманцёрам на электрастанцыі. У яго біяграфіі значыцца і работа кінамеханікам пасля вучобы на курсах у Мінску, загадчыкам нафтабазы ў саўгасе «Падалессе», электраманцёрам у вайсковай часці. За старанне ў рабоце ён мае каля дваццаці падзяк. Нябесныя выхавалі двух сыноў, аднаго з якіх, на жаль, ужо няма на гэтым свеце. У іх чатыры ўнукі і тры праўнукі.

У чэрвені франтавіку Сяргею Рыгоравічу Нябеснаму споўнілася 95 гадоў. Моцнага здароўя вам. Жывіце доўга-доўга. Усім на радасць!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

72 гады па жыцці з любімай жонкай.

Технический администратор доменных зон .БЕЛ и .BY ООО «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ» сообщает о проведении благотворительных аукционов на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра. Средства от аукциона, кроме стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут направлены на поддержку учреждений для детей-сирот, детей, оставшихся без попечения родителей, детей-инвалидов, детей с особенностями психофизического развития.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменных зонах .БЕЛ и .BY, исключенные из реестра. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте **https://auction.cctld.by.**

Даты проведения аукционов в период с января по июнь 2020 г.:

Дата начала январского аукциона доменов – 13 января 2020 г., дата окончания аукциона – 15 января 2020 г.

Дата начала февральского аукциона доменов – 10 февраля 2020 г., дата окончания аукциона – 12 февраля 2020 г.

Дата начала мартовского аукциона доменов – 16 марта 2020 г., дата окончания аукциона – 18 марта 2020 г.

Дата начала апрельского аукциона доменов – 13 апреля 2020 г., дата окончания аукциона – 15 апреля 2020 г.

Дата начала майского аукциона доменов – 11 мая 2020 г., дата окончания аукциона – 13 мая 2020 г.

Дата начала июньского аукциона доменов – 15 июня 2020 г., дата окончания аукциона – 17 июня 2020 г.

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 даты окончания аукциона. В случае если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе https://auction.cctld.by.

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или не резидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте https://auction.cctld.by.

Прием ставок прекращается по истечении 2 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен находится на сайте https://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов».

Организатор аукциона: ООО «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by.

Тел. организатора +375 17 239 57 02. Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 02.

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующего Тадаровского Константина Владимировича, 11.06.1979 года рождения, последние известные адреса: 1. Гомельская область, Речицкий район, д. Новый Барсук, ул Журавлевой, 5; 2. г. Василевичи, ул. Заслонова, 47.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2 месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Тадаровском Константине Владимировиче.

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белая ромашка», 231792, г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, тел./факс 801562-6-30-29

Предмет аукциона
Капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1

Лот №	Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
1	**Столовая** (здание специализированное для общественного питания)	672,7 кв. м	450/С-18925

Сведения о земельном участке: пл. 0,1316 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1316 га

Начальная цена с НДС 20 % – 250 093,19 бел. руб.

Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13

2	**Нежилое здание** (здание нежилое)	415,5 кв. м	450/С-24046
	Электрическая сеть (сооружение специализированное энергетики)	6,0 м	450/С-23996
	Водопроводная сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства)	79,0 м	450/С-23995

Сведения о земельном участке: пл. 0,0457 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий по ул. Я. Купалы, 13

Начальная цена с НДС 20 % – 38 774,56 бел. руб.

Условие аукциона: вовлечь в хозяйственный оборот объект недвижимости с момента заключения договора купли-продажи, а в случае проведения реконструкции (строительство, сноса недвижимого имущества) – в сроки, определенные разработанной проектно-сметной документацией

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

Задаток 10 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи – 30 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 12.11.2019 г.

Аукцион состоится 18.12.2019 в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.12.2019 до 17.00 по адресу**: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

Жыць прыгожа

КАЗАЧНЫ СВЕТ, САТКАНЫ З ВОЎНЫ

Вялікі тэатр у Маскве адкрыў сезон яскравай прэм'ерай «Казка пра Цара Салтана». Апошні раз гледачы бачылі пастаноўку 30 гадоў таму. У новай версіі на сцэне задзейнічалі вялікую колькасць тэхнікі, адных толькі перамен святла можна было ўбачыць некалькі сотняў. І канешне, для спектакля стварылі 340 новых унікальных касцюмаў. Гледачы выходзілі з тэатра ў захапленні, а журналісты адзначалі ў сваіх артыкулах незвычайную прыгажосць убрання герояў. Яно і сапраўды было нібыта зроблена чараўніком. І мне пашчасціла пазнаёміцца з адной са стваральніц гэтых касцюмаў, беларускім дызайнерам Ганнай СТРОЦАВАЙ, якая робіць адзенне з воўны. Якім жа чынам архітэктар па прафесіі стала аўтарам вытанчаных строяў?

ЧЫП РОДУ

У сям'і дызайнера ўсе былі рукастыя, прычым не толькі жанчыны, але і мужчыны. Ганна, можна сказаць, расла ў свеце хэнд-мэйда. Яе латвійская бабуля лічылася майстрам вышыўкі. Амаль усе тканыя рэчы ў доме былі ўпрыгожаныя ёю. Ганна бабулю не бачыла, але з дзяцінства памятае тыя вырабы.

— Мой тата таксама ўмеў вышываць, — расказвае дызайнер.— Гэта нібыта ўбудаваны ў кожнага члена нашай сям'і «чып». У нас дома ляжыць вялікі абрус, вышыты маім бацькам ў дзяцінстве. У тыя часы было цяжка, і мой тата моцна захварэў, не ведалі нават, выжыве ці не. Яму было гадоў дванаццаць, ён ляжаў у ложку. Каб не сумаваў, мая бабуля прыдумала выдаваць яму льняныя квадраты, на якіх ён вышываў ружы. Гэтыя вышыўкі бабуля злучала паміж сабой ільнянымі карункамі. І цяпер, калі бяру ў рукі той абрус, адчуваю сувязь паміж намі ўсімі.

Другая бабуля ў свой час была выбрана жыхарамі некалькіх вёсак для вялікай справы: ткаць убранне для алтара храма. Вось яе Ганна памятае, бо тая часта бывала ў іх і даглядала яе малую. Напрыклад, гуляе Ганначка ў цацкі, а побач бабуля вяжа: то берэцік для лялькі, то кофтачку, то сукенку. Але малая расла, і ёй самой хацелася нешта ствараць. Бабуля і маці заўсёды спынялі свае справы і паказвалі, як і што вязаць ці шыць. Калі Ганна стала больш дарослая, то магла з лёгкасцю ператварыць мужчынскую кашулю ў модную жаночую сукенку. Але бацькі Ганны працавалі ў Мінскпраекце і ўсімі магчымымі спосабамі далучалі яе да архітэктуры. Яны прыносілі ёй кубікі розных формаў і памераў, і дзяўчынка будавала па ўсёй кватэры фантастычныя гарады. Таму калі паўстала пытанне, куды паступаць, бацькі не адпусцілі Ганну ў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці вучыцца на мадэльера: яны не сумняваліся, што яна будзе архітэктарам. Ганна і сапраўды паступіла вучыцца на архітэктара, але працягвала рабіць адзенне для сябе, сям'і, сяброў.

ГЭТА НЕШТА МАГІЧНАЕ!

Скончыўшы інстытут, яна пайшла працаваць па спецыяльнасці. Але «час архітэктуры» быў непрацяглы. Хутка пачаліся дзевяностыя.

— Я страціла работу, — расказвае Ганна.— Але з цеплынёй успамінаю той узрушальны час неверагодных магчымасцяў. Здаралася, што я прачыналася і не ведала, чым буду карміць сваё дзіця, але ведала, як зарабіць. Мой муж ставіў дзіўныя спектаклі на сцэне Пала прафсаюзаў, працаваў з выдавецтвамі і пісаў. Я ж стала шыць на заказ. Набывала ў камісіёнцы паношаныя джынсы і шыла з іх курткі, потым рабіла са скуры розныя рэчы, адначасова вывучала і потым вырабляла народныя касцюмы. І ўжо ў 1999 годзе, цяжарная трэцім дзіцем, уступіла ў Саюз дызайнераў.

Аднойчы яна паехала з мужам адпачываць у Грузію і, прагульваючыся па Тбілісі, убачыла ў краме вялікія прыгожыя шалікі з воўны на шоўку (такая тканіна называецца нунавоўна). Гэта была не прывычная грубая воўна, а такая тонкая і далікатная, што Ганна адчула: гэта яе матэрыял.

— Стала працаваць з ім, і здавалася, што здзяйсняю нешта магічнае, — кажа дызайнер. — Уявіце, усе гэтыя шарсцінкі маюць сваю даўжыню, і пад уздзеяннем шчолачы і трэння кожная з іх ператвараецца ў маленькую цудоўную спіральку. А потым тыя спіралькі чапляюць адна адну, і на выхадзе атрымліваецца тая ці іншая рэч. Заўсёды ўкладвала ў свае работы і мастацтва, і архітэктуру, і працу з адзеннем, ды ўвогуле ўвесь свой жыццёвы досвед. І воўна магла ўсё гэта ўмясціць у сябе. Я адчувала, што не магу спыніцца, у маіх руках нараджаліся шалікі, камізэлькі, сукенкі, бясшоўныя паліто з дзіўнымі аплікацыямі кветак, лісцікаў, бурбалак...

КАСЦЮМ ДЛЯ ЦАРА

У хуткім часе рэчы, якія зрабіла Ганна, былі распрададзеныя на выстаўцы-кірмашы аўтарскіх вырабаў «Млын». Гэта ўпэўніла жанчыну, што яна на правільным шляху, і наступным разам яе аўтарскія работы паехалі ў Маскву, на выстаўку «Гранд Тэкстыль». Там і сустрэлася Ганна з заслужаным мастаком Расіі Вікторыяй Сеўруковай. Тая набыла ў дызайнера некалькі аўтарскіх работ і... прапанавала супрацоўніцтва. Так Ганна стала ствараць касцюмы для Вялікага тэатра.

— Гэта вельмі цікавая работа, — кажа яна. — Нават калі я рабіла апошні раз касцюм для цара Салтана, то немагчыма было зразумець, што на выхадзе атрымаецца. Вядома, ёсць нейкая ідэя, і ты прыкладна ўяўляеш, што трэба рабіць, каб рухацца ў патрэбным кірунку. Але воўна — нібыта жывы матэрыял, яна «дыхае» пад рукамі і сама нешта ад сябе дадае кожны раз. Таму і паўтарыць адну і тую ж рэч немагчыма, можна толькі зрабіць падобную.

Цяпер Ганна працуе над новай капсульнай калекцыяй, якую можна будзе ўбачыць на выстаўках-кірмашах у Мінску. І канешне, у пэўны час яна зноў ператворыцца ў чараўніцу, каб гледачы Вялікага тэатра маглі апынуцца ў фантастычным і казачным свеце.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Спытайце пра радзіннае

Як адзначаць залатое вяселле?

Цікавае пытанне мы атрымалі ад Ганны і Сяргея К. з Ельска Гомельскай вобласці. Яны пішуць: «2 лютага споўніцца 50 гадоў нашага сумеснага жыцця. Дзеці настойваюць, каб мы адзначылі залаты юбілей з размахам і абавязкова павянчаліся. Мы сумняваемся: ці трэба гэта рабіць, што гэта дасць, пражылі ж мы і так ладны век?»

Сталася так, што толькі «круглыя» даты мы называем юбілеем, а астатнія маюць простую парадкавую нумарацыю, у той час як амаль кожны новы год існавання сям'і атрымаў сваю персаніфікаваную назву: палатнянае, драўлянае, сярэбранае, залатое, рубінавае... вяселле. Аднак і ў гэтым карагодзе свят былі свае адметнасці, дамінанты, абрадава маркіраваныя акцэнты. Асаблівай павагай карысталіся вясельныя юбілеі — дваццаціпяцігоддзе (пры гэтым заўважым, што ў асабістым жыцці чалавека 25-годдзе не вылучалася асобай павагай) — сярэбраны юбілей, пяцідзесяцігоддзе — залатое вяселле. У славянскай і найперш у беларускай народнай культуры самым галоўным лічыўся залаты юбілей у жыцці сямейнай пары.

Як правіла, залатыя юбіляры перадавалі свае заручальныя пярсцёнкі якой-небудзь навастворанай пары (сваім унукам або праўнукам) як сімвал даўгавечнасці, згоды, узаемаразумення. У сваю чаргу, маладая пара павінна была купіць новыя пярсцёнкі і падарыць іх бабулі і дзеду. Звычайна не раілі ў адной і той жа сям'і спраўляць у адзін год два вяселлі, а вось у выпадку залатога юбілею лічылася вельмі пажаданым прымеркаваць шлюб маладой пары да залатога вяселля патрыярхаў свайго роду.

Таму, шаноўныя юбіляры, безумоўна, святкаваць залатое вяселле пажадана ўсім вашым родам, як сказалі — «з размахам». Было б вельмі хораша, калі б да святкавання гэтай падзеі далучыліся б мясцовыя органы ўлады, каб у загсе адбылася ганаровая рэгістрацыя залатога вяселля, прычым паралельна з імянарачэннем чыйго-небудзь паблізу па часе народжанага дзіцяці.

А што датычыцца абраду царкоўнага вянчання, то адзіна правільнае рашэнне могуць прыняць толькі самі юбіляры. Пазіцыя дзяцей павінна быць толькі кансультатыўнай, але не вырашальна-прымусовай. Тут ёсць адзін нюанс. Пазіцыя царкоўных іерархаў на гэты конт вядомая: усе невянчаныя шлюбы — грэшныя, як і дзеці, якія нарадзіліся ад гэтага шлюбу. Залатое вяселле нічога не зменіць у справе гарманізацыі адносін паміж юбілярамі. Мы — дзеці свайго часу, і наўрад ці трэба гуляць у сучасныя навамодныя гульні. Нехай нашы ўнукі выпраўляюць становішча і шукаюць адпаведнае духоўнае апірышча свайму шлюбнаму саюзу. Але пакуль што мы пастаянна сутыкаемся з цікавым парадоксам. Пасляваенныя пары, які не тое што не вянчаліся, але і вяселля нармальнага не ладзілі, — жывуць па 50 гадоў і болей, гадуючы па 15—20 унукаў. А сучасныя пары ездзяць на багатых лімузінах, ладзяць вяселлі ў прэстыжных рэстаранах, вянчаюцца (назаўтра пасля добрага падпітку, не кажучы пра тое, што першая шлюбная ноч нават і не помніцца, калі была) у незразумелым адзенні, аднак, на жаль, палова з іх хутка распадаецца. Таму яшчэ раз: вянчанне — падзея адказная, знакавая, будзе яно ці не — вырашаць у кожным выпадку самім маладым або сталага веку юбілярам.

І, як вымушае традыцыя, ад шчырага сэрца жадаем добрага здароўя, лёгкасці ў ногі, яснасці розуму, радасці ў дзецях і рэалізацыі спадзяванняў — ва ўнуках і праўнуках. Пажаданне — не віншаванне, якое загадзя рабіць нельга.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні на паштовы ці электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Цёмнае мінулае

СОН У ЛЕТНЮЮ НОЧ... У ШАФЕ

У Сярэднявеччы еўрапейцы спалі ў камодах і скрынях

Доўгія стагоддзі паняцце асабістай прасторы было вельмі абстрактным. Адасобіцца для сну маглі сабе дазволіць вельмі нямногія. Беднякі жылі ў цесных халупах, дзе часам туліліся тры пакаленні сям'і, а шляхта раз-пораз была вымушана дзяліць спачывальні з аховай і слугамі. Нават кароль Генрых V у першую шлюбную ноч з Кацярынай Валуа дзяліў спальню з упраўляючым і камергерам. Інтым у такіх выпадках стваралі полагі над ложкамі або... драўляныя скрыні, падобныя на шафы.

У Брытаніі, Шатландыі, Францыі, Галандыі і Германіі некалькі стагоддзяў карысталіся для сну незвычайнымі драўлянымі канструкцыямі, падобнымі на мэблю для захоўвання рэчаў і прадуктаў. Ложак-скрыня ўяўляў сабой асобна пастаўлены або ўбудаваны ў нішу сцяны прадмет абстаноўкі, усярэдзіне якога было ўсё, што трэба для камфортнага сну: пярына, падушка, коўдра і, галоўнае, адзінота.

Як гэта ні дзіўна, але ў часы Шэкспіра ў Англіі спалі ў скрынях амаль усе, хто мог дазволіць сабе замовіць ці змайстраваць уласнаручна хоць самае прымітыўнае сховішча. Рыцары, шляхетныя да́мы, архіепіскапы, гараджане і нават адносна заможныя сяляне аддавалі перавагу не ложку з полагам, а менавіта такой душнай, але ўтульнай драўлянай скрыні.

Дзверы яе зачыняліся на замок ці як мінімум закрываліся шчыльнымі шторамі. Зрэшты, першы варыянт быў найбольш распаўсюджаны, таму што інтымная абстаноўка — гэта далёка не ўсё, што патрабавалася ад вырабу. Скрыня, разлічаная на аднаго ці двух чалавек, добра захоўвала цяпло ў халодны час года і закрывала яго ад скразнякоў, якія былі ў тую эпоху звычайнай справай як для палаца лорда, так і для хаціны дрывасека.

Яшчэ адной функцыяй скрыні было захаванне бяспекі ўладальніка. Часы былі вельмі неспакойныя, і ў дом цалкам мог прабрацца калі не разбойнік, то драпежны звер. Зачыніўшы дзверы дома на завалу, а затым зачыніўшыся знутры ў скрыні-ложку, еўрапеец мог адчуць сябе ў адноснай бяспецы.

Многія даследчыкі ўпэўненыя, што ў сялянскіх сем'ях у скрынях дарослыя замыкалі дзяцей, калі сыходзілі ў поле працаваць. Акрамя гэтага, такая мэбля часта выкарыстоўвалася ўладальнікамі для захоўвання каштоўных рэчаў. З гэтай мэтай звонку ўсталёўвалі трывалы замок, а дзверцы і сценкі канструкцыі максімальна ўзмацнялі.

У выдадзенай у 1833 годзе ў Англіі «Энцыклапедыі катэджнай, фермерскай і дачнай архітэктуры і мэблі» апісаны выпадкі, калі ў падобных скрынях ўладкоўваліся паліцы. Іх размяшчалі ў нагах ложка і часам нават у 2—3 ярусы.

Адпраўляючыся спаць, гаспадар скрыні браў з сабой усё самае каштоўнае. Аўтары энцыклапедыі апісвалі гэта так: «У некаторых частках краіны дзверы ложкаў замыкаліся знутры на завалы або замок, каб у іх нельга было трапіць звонку. Таму чалавек, калі клаўся спаць з усім сваім скарбам на паліцах, мог замкнуць дзверы на ноч або пайсці на работу днём, замкнуўшы дзверы на засаўкі ці замкі».

За некалькі стагоддзяў да ложкаў-скрынь так прызвычаіліся, што ад іх не маглі адмовіцца і ў Новы час. У XVIII і XIX стагоддзях у многіх багатых дамах Еўропы актыўна выкарыстоўвалі такую мэблю, нягледзячы на вялікую колькасць спальняў, ацяпленне і адсутнасць небяспекі. У канцы XVIII стагоддзя многія мэблевыя майстэрні прапаноўвалі сваім кліентам скрыні для сну, замаскіраваныя пад кніжныя шафы і камоды. У такой мэблі гаспадар дома мог схавацца ад назойлівых гасцей або крэдытораў, пакінуўшы іх у поўным здзіўленні.

Але ў XIX стагоддзі мода на ложкі такога тыпу стала праходзіць. Заклапочанасць еўрапейцаў гігіенай і свежым паветрам прымусіла іх паступова адмовіцца ад старадаўняга звычаю лезці перад сном у скрыню. Нягледзячы на гэта, у некаторых вёсках Шатландыі і Ірландыі падобныя канструкцыі выкарыстоўваліся яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Сёння гэтыя дзіўныя ложкі можна ўбачыць хіба што ў музеі, дзе яны нязменна выклікаюць цікавасць і масу пытанняў у экскурсантаў.

Ложак-скрыня на карціне «Матчын доўг» Пітэра дэ Хуча.

Чулі?

НАВУКОЎЦЫ СПРАБУЮЦЬ ПЕРАМАГЧЫ СТАРАСЦЬ

Ці, прынамсі, крыху яе «прытармазіць». Яны пратэсціравалі на людзях «лекі ад старасці», і падобна на тое, што яны працуюць, але сцвярджаць з абсалютнай упэўненасцю ніхто, вядома, не бярэцца.

Старэнне цягне за сабой мноства хвароб. Асабліва з гадамі павялічваецца рызыка ўзнікнення захворванняў, звязаных, зразумела, з узростам — сардэчна-сасудзістых, раку і дэменцыі. Навукоўцы з медыцынскага каледжа пры Дрэксельскім універсітэце ў Філадэльфіі вырашылі праверыць, ці атрымаецца ў іх запаволіць старэнне.

Рапаміцын першапачаткова быў адкрыты як антыбіётык, але хутка стаў выкарыстоўвацца як імунадэпрэсант. Яго ўжываюць для таго, каб пазбегнуць непрымання органаў пры трансплантацыі. Група навукоўцаў пад кіраўніцтвам Крысціяна Села правяла клінічныя выпрабаванні рапаміцыну на скуры рук 36 добраахвотнікаў. У выніку прэпарат паменшыў колькасць старых клетак на скуры і палепшыў знешні выгляд рук паддоследных.

Рукі паддоследнай 67-гадовай жанчыны пасля эксперымента. Злева — рука, якую мазалі плацэба, справа — рука, якая зазнала ўздзеянне крэму з рапаміцынам.

У 2006 годзе ўпершыню было паказана, што рапаміцын падаўжае жыццё эўкарыёт. У 2009 годзе навукоўцы зафіксавалі павелічэнне максімальнай працягласці жыцця мышэй, якім давалі прэпарат: самак на 14 %, самцоў — на 9. Калі рэчыва трапляе ў арганізм, яно блакуе бялковы комплекс TOR, які адказвае за рост і размнажэнне клетак. Гэтае блакіраванне дазваляе запавольваць натуральны працэс старэння клеткі. Сёлета навукоўцы ўпершыню выпрабавалі дзеянне рапаміцыну на людзей — да гэтага правяраць прэпарат на людзях не рашаліся, баючыся пабочных эфектаў.

Для эксперымента адабралі 36 чалавек, старэйшых за 40 гадоў, з прыкметамі старэння скуры. Кожнаму з іх выдалі два віды крэму: для правай і левай рукі. Адзін з іх утрымліваў невялікую канцэнтрацыю рапаміцыну, другі складаўся з плацэба. Удзельнікі павінны былі наносіць крэм на рукі перад сном раз на адзін-два дні. Эксперымент доўжыўся восем месяцаў. Да яго канца дайшлі толькі 19 удзельнікаў, астатнія перасталі выходзіць на сувязь або адмовіліся ад удзелу. 13 чалавек далі згоду на аналіз крыві, што дазволіла пацвердзіць, што ў іх крыві не ўтрымліваецца рапаміцын.

Клінічнае паляпшэнне знешняга выгляду скуры было адзначана ў некалькіх удзельнікаў, а імунагістахімічны аналіз выявіў паляпшэнне стану скуры і на гісталагічным (тканкавым) узроўні. Было выяўлена, што колькасць старых клетак, якія не дзеляцца, на руках, што мазалі крэмам з прэпаратам, зменшылася ў тры разы. Таксама навукоўцы адзначылі візуальныя паляпшэнні: на руках паддоследных сталі менш праступаць вены і сухажыллі, а колькасць маршчын зменшылася.

Пры гэтым ніякіх прыкмет запалення або паталогій выяўлена не было. Даследчыкі заключылі, што рапаміцын здольны змагацца са старэннем скуры нават у невялікіх канцэнтрацыях. У далейшым навукоўцы спадзяюцца атрымаць больш звестак пра механізмы ўплыву гэтага прэпарату на клеткі чалавека.

У РАСІІ ТЭСЦІРУЮЦЬ VR-АКУЛЯРЫ ДЛЯ КАРОЎ

Прататып акуляраў віртуальнай рэальнасці распрацаваны для паляпшэння ўмоў утрымання буйной рагатай жывёлы, піша nat-geo.ru.

Супрацоўнікі адной з найбуйнейшых гаспадарак Падмаскоўя сумесна з IT-спецыялістамі вырашылі правесці эксперымент па ўкараненні віртуальнай рэальнасці ў сельскую гаспадарку. Аўтары даследавання адштурхоўваліся ад ідэі аб тым, што новыя тэхналогіі і, у прыватнасці, камп'ютарызацыя спрашчаюць рабочыя працэсы ў многіх сферах. Таксама вядома, што эмацыянальны стан жывёл наўпрост адбіваецца на іх прадукцыйнасці.

Згодна з аналізам, праведзеным Scotland's Rural College ў Шатландыі і Wageningen University ў Нідэрландах, умовы навакольнага асяроддзя аказваюць істотны ўплыў на здароўе кароў і, як вынік, на колькасць і якасць малака. На аснове інтэрв'ю фермераў, якія выкарыстоўваюць розныя сістэмы для паляпшэння дабрабыту жывёлы, была сфармуляваная сувязь паміж станоўчым, у тым ліку эмацыянальным, вопытам кароў і пазітыўным уплывам на надоі.

Амерыканскія фермеры ставяць у стойлах шчоткі, якія аўтаматычна круцяцца і замяняюць каровам масажыста. У Еўропе выкарыстоўваюць рабатызаваныя сістэмы для забеспячэння максімальна вольнага перамяшчэння жывёлы па ферме. Расійскія вытворцы ўстанаўліваюць гукавое абсталяванне для трансляцыі класічнай музыкі, расслабляльны эфект якой станоўча ўплывае на малакааддачу. Яшчэ адным наваўвядзеннем у гэтым шэрагу сталі акуляры віртуальнай рэальнасці для кароў, створаныя пры супрацоўніцтве з ветэрынарнымі ўрачамі.

Чалавечыя VR-акуляры былі адаптаваныя з улікам асаблівасцяў будовы галавы кароў. Абапіраючыся на шматлікія даследаванні зроку буйной рагатай жывёлы, якія паказваюць лепшае ўспрыманне каровамі адценняў чырвонай часткі спектра і слабейшае — зялёных і сініх тонаў, архітэктары віртуальнай рэальнасці стварылі ўнікальную праграму імітацыі зялёнага поля, залітага сонцам. Падчас правядзення першага тэсціравання было зафіксавана зніжэнне трывожнасці і павышэнне агульнага эмацыянальнага настрою статка.

Далейшае комплекснае вывучэнне пакажа ўплыў VR-акуляраў на малочную прадукцыйнасць кароў. Пры захаванні станоўчай дынамікі распрацоўшчыкі маюць намер маштабаваць праект і мадэрнізаваць айчынную сферу малочнай вытворчасці: удасканаленне тэхналогій павінна паўплываць на галіну ў цэлым.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

№ лота	Наименование объекта/ Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании
1	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Платановая, 44** и земельный участок	140100000001021654	0,0998	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**46 882,93**	9300,00	**2622,04**	0,0040 га – охранная зона линий связи и радиофикации (подземная кабельная линия); 0,0012 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,0998 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях
2	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Клейниковская, 6** и земельный участок	140100000001024135	0,1325	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**26 768,46**	5300,00	**2592,38**	0,0006 га – охранная зона линий связи и радиофикации (подземная кабельная линия); 0,0002 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0007 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления)
3	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Боровая, 56** и земельный участок	140100000001023238	0,1087	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**30 177,16**	6000,00	**2639,05**	0,0044 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0046 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1087 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **2 550,00 рублей**

Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

– часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

– часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

– возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

– компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• не позднее одного месяца с момента подписания акта приема-передачи получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• заключить договор на разработку проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома в течение 20 календарных дней с даты получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 3 месяцев с даты заключения данного договора, обеспечить ее изготовление;

• представить изготовленную проектную документацию для утверждения в Брестский городской исполнительный комитет в течение 30 календарных дней с даты ее изготовления;

• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся

Аукцион состоится 9 января 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 04.12.2019 г. до 17.30. 03.01.2020 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, **www.city.brest.by** и www gki.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Свирьагро» (продавец) проводит открытый повторный аукцион по продаже имущества в составе:

